Апошняе папярэджаньне ЦК і СНК павінна прымусіць нас работаць па-бальшавіцку.

Н буксір гомельскіх рабочых і калгасьнікаў, адкажам неадкладным завяршэньнем сяўбы, поўным выкананьнем пасеўнага пляну.

ВІЦЕБСК, ГАРКОМУ КП(б)Б.

Ход сяўбы ў Віцебскім раёне праходзіць пры яўна нездавальняючым кіраўніцтве з боку гаркома і гарсавета. З самага пачатку сяўбы з боку віцебскіх арганізацый замест дзелавой барацьбы за сяўбу былі спасылкі і разгаворы аб неспрыяючым надворʼі і апасеньні недасеву. ЦК і СНК за ход сяўбы неаднакроць папярэджвалі партыйнае і савецкае кіраўніцтва Віцебску аб неабходнасьці прыняцьця рашучых мер да забесьпячэньня бальшавіцкага ходу сяўбы, улічваючы вядучую ролю Віцебска ў групе паўночных раёнаў. Аднак, гарком і гарсавет да сёньняшняга дня не зрабілі практычных вывадаў з папярэджваньняў і ўказаньняў ЦК і СНК і ня толькі ня выканалі сваёй ролі, як вядучага раёну па паўночнай групе, але ганебна адстаюць ад раду раёнаў гэтай-жа групы па агульнай сяўбе і сяўбе ў прыгарадных гаспадарках у параўнаньні з іншымі гарадамі: на 3 мая Віцебск мае 53 проц. выкананьня пляну, даўшы за апошнюю пяцідзёнку яўна ганебныя тэмпы росту—каля 7 проц.

ЦК і СНК падкрэсьліваюць пэрсанальную адказнасьць за такі дрэнны ход сяўбы сэкратара гаркому Міцькова і старшыні гарсавета Кардашэнка. Калі тт. Міцькоў і Кардашэнка ня ў стане бальшавіцкімі тэмпамі работы скончыць сяўбу ва ўстаноўленыя партыяй тэрміны, яны абавязаны адкрыта паставіць аб гэтым пытаньне перад ЦК.

У апошні раз папярэджваючы кіраўніцтва Віцебска, ЦК і СНК ня толькі патрабуюць, але ўпэўнены, што кіраўніцтва віцебскай арганізацыі, асабліва тт. Міцькоў і Кардашэнка, зробяць усе неабходныя вывады з гэтага папярэджаньня і даб'юцца неадкладнага пералому ў ходзе сяўбы, забясьпечыўшы сканчэньне яго ў бліжэйшую пяцідзёнку. ЦК і СНК даручаюць тт. Міцькову і Кардашэнка ў бліжэйшыя дзень—два, па атрыманьні гэтай дырэктывы, перабудаваць сваю работу, а таксама работу партыйных і савецкіх арганізацый такім чынам, каб забясьпечыць сапраўды бальшавіцкую барацьбу за хутчэйшае сканчэньне сяўбы на Віцебшчыне.

Па атрыманьні гэтай тэлеграмы абгаварыць яе на сумесным пасяджэньні бюро гаркому, прэзыдыумаў гарсавету і гарКК, вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы, а таксама і ацэнку работы з апублікаваньнем у раённым друку.

ГІКАЛО, ГАЛАДЗЕД.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ГРАМАДЗКАГА БУКСІРА.

Пастанова бюро Гомельскага гаркому КП(б)Б ад 2 чэрвеня 1933 г.

У адпаведнасьці з рашэньнем ЦК КП(б)Б, бюро ГК пастанаўляе:

Узяць на буксір па правядзеньні веснавой сяўбы Віцебскі, Церахоўскі і Веткаўскі раёны, накіраваўшы буксірныя брыгады ў складзе:

у Віцебскі раён—ЩАФАРЭНКА, КАЛМЫК, ЗНАМЕНСКАЯ, МАЛАСТОЎКЕР;

у Церахоўскі раён—АСТАШОНАК, ХАХЛОЎ, ЛЯШКО, ПРУСАКОЎ, ДАКУТОВІЧ, ХАЙКІН, КАЛЕСЬНІКАЎ;

у Веткаўскі раён—ФЁДАРАЎ, ПАРФЕНАЎ, АРОНАВА, АБАЎ, БЕЛАМУТАЎ, СТРАЛЬНІЦКІ, ЯСТРАБАЎ, ЧЭРНІН.

Выконваючы свой пралетарскі абавязак, выходзячы з камуністычнага прынцыпу работы—дапамогі адстаючым і бяручы на буксір Гомельскага раёну Віцебскі, Церахоўскі і Веткаўскі раёны бюро ГК заклікае партыйную і савецкую грамадзкасьць раёнаў да дружнай сумеснай работы па ліквідацыі прарываў у сяўбе, за тое, каб уся БССР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, выйшла ў рады перадавых рэспублік па выкананьні пляну сяўбы, заваявала пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю, і высокаякасным правядзеньнем сяўбы выканаць лёзунг правадыра партыі т. Сталіна—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Адначасова бюро ГК зьвярт ецца да шырокай грамадзкасьці Гомельшчыны, да ўсіх камуністаў, камсамольцаў нашай арганізацыі, да ўсіх калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў мабілізаваць ўсе сілы і сродкі на перавыкананьне плянаў веснавой сяўбы, на бальшавіцкае правядзеньне праполачна ўборачнай кампаніі і, што зьявіцца лепшай падтрымкай нашым брыгадам, аказваючым дапамогу іншым раёнам, разам з тым дапаможа Гомельшчыне выйсьці у шарэнгі перадавых па БССР.

Даручыць выяжджаючым брыгадам у Церахоўскі і Веткаўскі раёны разам з работай па сяўбе дапамагчы гэтым раёнам і ў справе выкананьня заданьня па пазыцы.

Сэкратар Гомельскага ГК КП(б)Б ШАФАРЭНКА.

АБ ХОДЗЕ ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Пастанова бюро ГК, прэзыдыуму гарКК КП(б)Б і прэзыдыуму гарсавету ад 3 га чэрвеня.

Бюро ГК, прэзыдыумы гарКК і гарсавету атуюць, што з першых-жа дзён пасеўнай кампаніі, Віцебскі раён ня толькі не заняў вядучай ролі, якую ён, як раён буйнага пралетарыяту пэнтру, павінен быў адыгрываць на Рэспубліцы і, у прыватнасьці, па паўночнай зоне, але ўвесь час ганебна адстае як па ўсёй сяўбе, так і па каапгасах.

Выключна нездавальняючыя тэмпы сяўбы, прырост засеянай плошчы, (у асобныя дзёнкі даходзячы да 4,5 проц.—у пятую дзёнку мая), прыводзілі да ўсё большага абваленьня прарыву ў пасеўнай кампаніі, у час, як маюцца выключна спрыяючыя абставіны для найлепшага бальшавіцкага правядзеньня пасеўнай кампаніі: наяўнасьць вялікай партыйнай арганізацыі з моцным пралетарскім ядром, вышэйшая сярэдняга па Рэспубліцы рэнтант калектывізацыі, шырокія магчымасьці скарыстаць арганізацыйныя і тэхнічныя шэфскіх арганізацый гораду і навучальных устаноў, забясьпечанасьць насеньнем і мінеральным угнаеньнем.

Нягледзячы на неадназразовыя папярэджаньні і паказаньні ЦК КП(б)Б і СНК БССР, гарКК і гарсавет не зрабілі неабходных рашучых практычных вывадаў з гэтых папярэджаньняў, не скарысталі ўсіх магчымасьцей і сами не забясьпечылі бальшавіцкага ходу сяўбы, нездавальняюча кіруючы ходам яе.

У прыватнасьці ГК, ГКК і прэзыдыум гарсавету адзначаюць:

а) у ходзе сяўбы ня толькі не была разгорнута самая жорсткая бязьлітасная барацьба з кулацтвам і спэкуляцыяй, з апортуністычным хныканьнем і разважаньнямі, з неспрыяючым надворʼі, што ўзмацняе сілы апартуністычных элемэнтаў;

б) не былі скарыстаны вурокі загатавіцельнай кампаніі і паказаньні ЦК УсесЦ(б) і ЦК КП(б)Б па пытаньнях загатовак, у выніку чагобыло паслаблена барацьба з кулацкімі апартуністычнымі, буржуазна-капіталістычнымі элементамі ў горадзе і ў вёсцы, нягледзячы на ўмі актыўнае супраціўленьне гэтых элемэнтаў пачатку сяўбы, зацягваньне імі сяўбы, з боку бюро ГК, прэзыдыуму ГК і прэзыдыуму гарсавету не была мабілізавана ўся партарганізацыя і савецкі актыў рашучы адпор і барацьбу са шкодніцкімі элементамі;

в) кіраўніцтва сельсаветамі і калгасамі пастаўлена апэрацыйна і канкрэтна, пры гэтым адсутнічаньні кантролю за выкананьнем рашэньняў і паказаньняў ГК і гарсавету і раённых адносін да тых, хто не жадае выконваць дырэктывы партыі і ўраду.

Тэлеграма тт. Гікала і Галадзеда ад 3 чэрвеня зьяўляецца апошнім папярэджаньнем гарсавету, гарсавету і ўсёй Віцебскай партарганізацыі і патрабуе ад нас «перабудаваць сваю работу такім чынам, каб забясьпечыць бальшавіцкую барацьбу за хутчэйшае сканчэньне сяўбы па раёну». Гарком, гарКК і гарсавет лічаць, што адказам на гэтую тэлеграму павінна зьявіцца бездакладнае завяршэньне сяўбы па раёну.

Бюро ГК і прэзыдыумы гарКК і гарсавета пастанаўляюць:

1. Давесьці зьмест тэлеграмы тт. Гікала і Галадзеда, да ўсёй партыйнай арганізацыі, аблікаваць яе ў друку і нарачнымі даслаць упаўнаважаным гаркому і сэкратарам ячэек. Дапанаваць ўсім партʼячэйкам і сельсаветам у падставе самай рашучай бальшавіцкай самакрытыкі выкрыць прычыны ганебнага становішча сяўбы, вынесьці рашучы ўдар апартуністычным элемэнтам зрываючым сяўбу практычнымі мерапрыемствамі забясьпечыць выкананьне пасеўных плянаў. Па Міхалёўскаму, Замастоцкаму сельсаветам—ў трохдзённы тэрмін, па Даўжанскаму, Рудніцкаму, Рудакоўскаму, Старасельскаму сельсаветам—у 10 дзён, у астатніх сельсаветах—у пяцідзённы тэрмін.

2. Папярэдзіць усіх упаўнаважаных гаркому, што яны нясуць поўную адказнасьць за ход сяўбы па сваім сельсавеце і абавязаны ажыцьцяўляць кіраўніцтва сяўбой так, каб былі забясьпечаны бальшавіцкія тэмпы яе.

Паставіць на від тт. Зіноўеву і Гарэліку за нездавальняючае кіраўніцтва сяўбой па Рудакоўскаму і Старасельскаму сельсаветам і патрабаваць ад іх як членаў гаркому, а т. Зіноўева, як члена бюро ГК безадкладна вывесьці свае сельсаветы з ганебнага прарыву.

3. Адзначаючы вусім дрэннае кіраўніцтва сяўбой з боку сельскіх саветаў, якія абавязаны ажыцьцяўляць непасрэднае кіраўніцтва гаспадарчай дзейнасьцю калгасаў і аднаасобнікаў і забясьпечваць чоткае бальшавіцкае выкананьне гаспадарча-палітычных заданьняў, гарком, гарКК і гарсавет патрабуюць ад старшынь сельсаветаў практычнага кіраўніцтва сяўбой.

За яўна апартуністычнае нежаданьне арганізаваць паскарэньне тэмпаў сяўбы, невыкананьне спэцыяльных рашэньняў пасеўкому па Даўжанскаму сельсавету, старшыню сельсавету Гудаева выключыць з партыі і зьняць з работы. Накіраваць для работы ў Даўжанскім сельсавеце тав. Піскунова.

За незабесьпячэньне бальшавіцкага кіраўніцтва сяўбой абвясьціць суровую вымову і зьняць з работы старшыню Рудніпкага сельсавету т. Міхеева. Накіраваць на работу ў Рудніцкі сельсавет т. Іванова, аслабаніўшы яго ад абавязкаў упаўнаважанага па Міхалёўскім с. с.

За незабесьпячэньне кіраўніцтва сяўбой абвясьціць вымову старшыням Рудакоўскага сельсавету т. Кербелю і Старасельскага сельсавету т. Аржаноўсваму, абавязаўшы іх прыняць бездакладныя меры па рашучаму пералому ў ходзе сяўбы па іх сельсаветам.

Накіраваць для работы ў Машканскім сельсавеце т. Шалаеву.

4. Абавязаць упаўнаважаных ГК, сэкратароў партʼячэйкі, старшынь сельсаветаў забясьпечыць карэнны пералом у ходзе сяўбы па аднаасобнаму сэктару, паўторна прапрацаваць пастановы партыі і ўраду аб пастаўцы сельска-гаспадарчай прадукцыі і аб сельгаспадатку, арганізаваць штодзённую праверку ходу сяўбы па кожнаму пункту і асобнай гаспадарцы, мабілізаваць усіх членаў сельсавету і сельсаведкі актыў для падворнага абыходу аднаасобнікаў, растлумачваючы закон аб падатку, спалучаючы масава-палітычную работу сярод прапоўных аднаасобнікаў з самымі рашучымі мерамі ў адносінах да сабатажнікаў сяўбы, пусьціўшыхся ў спэкуляцыю.

Адзначаючы выключна ліберальны падыход да кулацка-заможных гаспадарак, з боку сельсаветаў, абавязаць упаўнаважаных і старшынь сельсаветаў прымусіць гэтыя гаспадаркі выканаць заданьне па сяўбе на працягу трох дзён.

5. Адзначаючы ўсё яшчэ дрэннае кіраўніцтва сяўбой па каапгасам з боку трыкутнікаў прадпрыемстваў, у апошні раз папярэдзіць дырэктароў, сэкратароў парткалектываў і старшынь фабзаўкомаў аб іх поўнай і безагаворачнай адказнасьці за прыгарадныя гаспадаркі.

За выключна дрэннае кіраўніцтва каапгасамі абвясьціць вымову Ханікай, Жураву, Шульман (фабрыка імя Клары Цэткін) і Гіцовічу (ЦРК). Абвясьціць суровую вымову дырэктарам каапгасаў „Новы шлях"—Русаку і „Білева"—Ахрамейка і папярэдзіць іх, што пытаньне аб іх далейшым прабываньні ў партыі стаіць у прамой залежнасьці ад таго, як яны забясьпечаць сканчэньне сяўбы за бліжэйшую пяцідзёнку.

Абавязаць тав. Манкіна (шчоткамбінат) не позьней раніцы 4 чэрвеня перакінуць у каапгас «Новы шлях» трактар і 10 коней, тав. Варківа («Прафінтэр»)—10 коней.

6. У выніку выключна нездавальняючага ходу сяўбы, Віцебшчына апынулася ў глыбокім тыле спаборніцтва з Гомельскім і Менскім раёнамі і спаборніцтва БССР з Заходняй вобласьцю.

Выконваючы свой пралетарскі абавязак, партарганізацыя і прапоўныя масы Гомельшчыны, у мэтах дасягненьня агульнай перамогі; узялі наш раён на сацыялістычны буксір. Абавязак кожнага камуніста і ўсёй нашай партарганізацыі, кожнага рабочага калектыву, саўгасу, калгасу—максымальна скарыстаць братэрскую дапамогу Гомельшчыны, высока ўзьняць сацспаборніцтва ўнутры раёну і мабілізавацца на барацьбу за ліквідацыю адставаньня Віцебшчыны.

Абавязаць упаўнаважанага ГК і сэкратароў сельпартʼячэек 3-га і 4 га чэрвеня скліканць па брыгадах (у абедзены перапынак альбо пасьля работы) кароткія мітынгі рабочых саўгасаў і каапгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў, паведаміць іх аб увяцці Віцебшчыны на буксір і нашых абавязках у сувязі з гэтым, прыняць на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы для адказу гомельскім рабочым і калгасьнікам завяршэньнем сяўбы.

Сэкратарам фабрычна-завадзкіх партʼячэек безадкладна скліканць мітынгі рабочых для прыняцьця канкрэтных самаабавязацельстваў у адказ гомельскім рабочым і распрапоўцы мер для бездакладнага завяршэньня сяўбы ў каапгасах, двойнай дапамогі падшэфным сельсаветам і ўзмацненьня барацьбы за прамфінплян.

Устанавіць пераходны чырвоны сьцяг гаркому КП(б)Б для лепшага паходу сяўбы сельсавету і прапанаваць сельпартʼячэйкам і сельсаветам мабілізаваць масы на барацьбу за заваёву гэтага сьцягу, арганізаваць практычную дапамогу рабочай і цягляй сілай адстаючым брыгадам, калгасам, каапгасам і саўгасам з боку перадавых брыгад, саўгасаў, каапгасаў, калгасаў і аднаасобнікаў, завяршыўшых сяўбу.

Прапанаваць сэкратарам парткалектываў, старшыням фабкомаў, прадпрыемстваў, маючых прыгарадныя гаспадаркі, узмацніць барацьбу за чырвоны сьцяг гарпрафсавета і «Віцебскага пралетара». Паставіць на від сакратару парткалектыва фабрыкі «Дзьвіна» тав. Вэксьлеру і старшыні фабкому тав. Собалевай за дрэнную мабілізацыю рабочых з мэтай пазбавіцца рагожнага сьцягу гарпрафсавету і „Віцебскага пралетара", уручанага каапгасу імя МОПР.

7. Адзначаючы, што рэдакцыя „Віцебскага пралетара" не ўзначаліла сацспаборніцтва з Менскім, Гомельскім і Ярцаўскім раёнамі, нездавальняюча разгарнула масавую арганізацыйную работу на вёсцы, абавязаць рэдакцыю, пад пэрсанальную адказнасьць тав. Розэнблюма, бездакладна забясьпечыць масавы кантроль зьнізу, перанясеньне вопыту лепшых брыгад і калгасаў, рашучае падхлёстваньне адстаючых, разгортваньне шырокага сацспаборніцтва і грамадзкага буксіру, адпаведным чынам перабудаваўшы работу сельпартарганізатараў на друку.

8. Абавязаць партʼячэйкі і сельсаветы рашуча пакончыць з гніла-ліберальнымі адносінамі да крыўшчыкаў сяўбы, кулацкіх сабатажнікаў, прымяючы да іх самыя рашучыя меры. Партʼячэйкі абавязаны выкідваць з партыі перараджэнцаў, апартуністычных бязьдзельнікаў, двурушнікаў, памятуючы, што бальшавіцкая вартасьць партыйца правяраецца на яго рабоце па выкананьні дырэктыў партыі. У прыватнасьці, абавязаць Старасельскую партʼячэйку абгаварыць пытаньне аб апартуністычнай дзейнасьці кандыдата партыі Сімёнава, Бабініцкай ячэйкі—Тарасава і Дзянісенка, Рудакоўскай ячэйкі—Зайцава.

Разам з тым гарком, гарКК і гарсавет самым рашучым чынам падкрэсьліваюць, што ў аснову нашай барацьбы за бездакладнае сканчэньне сяўбы павінна быць пакладзена масава-палітычная работа і гаспадарча-арганізацыйная дапамога брыгадзе, калгасу, вёсцы.

9. Абавязаць ўпаўнаважаных гаркому адразу-жа па атрыманьні гэтай пастановы скліканць нараду кіруючых работнікаў сельсаветаў і прыняць на ёй мерапрыемствы, забясьпечваючыя поўную ліквідацыю прарыву і бездакладнае сканчэньне сяўбы.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Віцебскі пралетары

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 127 | НЯДЗЕЛЯ, 4 чэрвеня 1933 г. | № 127

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

Лепшых з лепшых—у праверкомы.

Лесзавод № 13.

Варты чысьціць іншых.

На лесзаводзе № 13 праходзіў чыстку член ячэйкі лесзаводу, старшыня гарКК КП(б)Б тав. Вэнзель.

— Я, —кажа тав. Вэнзель,—нарадзіўся ў 1899 г. у г. Менску. Бацька мой быў бондарам, працаваў на заводзе Ракаўшчыка. Мае браты яшчэ ў 1905 годзе прымалі ўдзел у рэвалюцыйным руху.

Мне з 1914 году прыйшлося пайсьці на работу і вучыцца сталяром у прыватнай майстэрні Маляўскага, дзе і працаваў да 1917 году.

У пачатку 1917 году тав. Вэнзель паступіў на работу ў саюз гарадоў і ў лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. ён з групай рабочых уступае ў Бунд. Работаючы пасьля гэтага ў прыватнай майстэрні і атрымоўваючы нізкую заработную плату, ён арганізоўвае забастоўку. Запатрабаваньні бастуючых не задаволены, т. Вэнзель зварачваецца да старшыні гарадзкой думы Вайнштэйна (былы бундавец), які дае наступны адказ: „Дума ў гэтую справу ня ўмешваецца, гэта чыста гаспадарчая справа". Атрымаўшы такі адказ, у Вэнзеля адразу зьяўляецца недаверра да Бунду і ўпэўненасьць у тым, што ён ня можа абараняць рабочыя інтарэсы, бо зьяўляецца буржуазнай арганізацыяй. Тэв Вэнзель пачынае адыходзіць ад Бунду і ў 1917 г. у пэрыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі, уступае ў рады камуністычнай партыі.

Немцы акупавалі Менск. Тав. Вэнзель работае ў падпольлі загадчыкам складам літаратуры. У Менску савецкая ўлада; ЦК мабілізуе Вэнзеля і накіроўвае палітруком у адну з частак, з якой ён накіроўваецца ў Вільню і адтуль зноў у Менск, пасьля заняцьця палякамі Вільны.

Беларусы займаюць Менск, тав. Вэнзель хворы, ня можа эвакуявацца. Пасьля выздараўленьня ён адразу ўключаецца ў работу падпольнай арганізацыі. Чырвоная армія вызваляе Беларусь ад беларусаў, і потым у т. Вэнзеля пачынаецца розная адказная партыйная, прафсаюзная і гаспадарчая работа.

Упэўнена і па-бальшавіцку цьвёрда т. Вэнзель адказвае на тыя запытаньні, якія яму даюцца з боку членаў партыі і беспартыйных рабочых, якія прысутнічаюць на сходзе.

Тав. Жаброўскі запытвае ў рабочых: „Як, рэкамэндуеце тав. Вэнзеля ў склад праверкому?"

— Рэкамэндуем.

— Варты чысьціць іншых.

Палітэхнікум.

Часьціна гісторыі бальшавіцкай партыі.

Біяграфія гэтага чалавека—гэта часьціна, гісторыі нашай партыі. Нельга, гаворачы аб ёй, ня ўспомніць рэвалюцыйную барацьбу, якую вяла рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў да Кастрычніцкай рэвалюцыі і пасьля яе.

Сын рабочага, сам па прафэсыі сталяр, тав. Карчэўскі з 1909 году прымае актыўны ўдзел у падпольнай рабоце партыі і ў 1912 г. становіцца членам гэтай партыі, аддана змагаючыся за інтарэсы рабочае клясы.

У 1912 годзе пасьля ленскіх рэстрэлаў Карчэўскі прымае актыўны ўдзел у забастоўцы пратэсту, у гэтым-жа годзе за забойства правакатара арыштоўваецца і да лютаўскай рэвалюцыі знаходзіцца ў турме.

З часу лютаўскай рэвалюцыі ён пасьлядоўна—член партызанскага атраду, начальнік апэрацыйнага аддзелу Багароцкай ЧК, потым мабілізоўваецца на фронт, пападае ў палон да казакаў, адкуль уцякае.

Пасьля грамадзянскай вайны т. Карчэўскі працуе на розных адказных партыйных пасадах. Партыя яго накіроўвае на вучобу ў Сьвердлоўскі ўнівэрсытэт, скончыўшы які, ён работае ў Віцебскім гаркоме партыі інструктарам, а зараз выкладчыкам палітэканоміі ў палітэхнікуме.

Ясна і коратка, ўпэўнена тав. Карчэўскі адказвае на ўсе пытаньні, якія задаюцца з боку сабраўшыхся партыйцаў, студэнтаў, выкладчыкаў і рабочых.

— Адводаў няма?—запытваецца т. Галадзед.

— Няма.

Значыць рэкамэндуеце яго ў склад праверкому?

— Рэкамэндуем.

— Пабольш такіх у склад праверкому,—нясецца з залі голас сабраўшыхся.

Л. Эпінгоф,
Е. Махавер.

Шчацінна-шчотачны камбінат.

Дзьве супроцьлегласьці.

Пяць месяцаў таму назад на камбінаце адбылася здарэньне, якое ўсхвалявала ўсіх рабочых.

Можна было ўбачыць цэлую групу рабочых і работніц, якія сабраліся вакол дошкі ходу выкананьня прамфінпляну па цэхах. Уся ўвага была сканцэнтравана на намаляваны аэраплян—самы лепшы і высокі паказальнік выкананьня прамфінпляну, пад якім крэйдай было выведзена лічба „104 проц.", а яшчэ ніжэй „шчацінны цэх".

І сапраўды было чаму дзіву давацца. Пачынаючы з 1931 году ня было ніводнага квартала, месяца, дэкады, дню, калі б шчацінны цэх выканаў сваё вытворчае заданьне вышэй 60—70 проц. Прарыў быў настолькі вялікі і сурʼёзны, што награжаў зрывам выкананьня прамфінпляну ўсяго камбінату. Больш таго, былі дні, калі цэх рабіў па 70 кілё браку гатовай прадукцыі.

І ў шчацінным цэх быў прызначаны ў якасьці загадчыка цэха т. Мышалаў, дагэтуль працаваўшы намесьнікам дырэктара камбінату. Пачынаючы з гэтага часу шчацінны цэх сыстэматычна выконвае вытворчае заданьне на 103—104 проц.

* * *

Аб усім гэтым расказвае цяпер т. Мышалаў камісіі па чысткі, правяраючай яго—намечанага ў члены праверкому.

— У першы-жа дзень работы ў шчацінным цэху,—разказвае ён,—я заўважыў усю неправільнасьць сыстэмы пастаноўкі работы. Абязьлічка, неправільная расстаноўка сіл, лодырніцтва—усё гэта стаяла ўпоперак дарогі нармальнай работы цэху.

Тав. Мышалаў зьнішчыў гэтыя дэфэкты, правільна арганізаваў працу, перавёў усе машыны ў асобнае памяшканьне. Акрамя гэтага часта зьбіраліся вытворчыя нарады, дзе абгаварваўся плян работы цэху.

Жыцьцяпіс тав. Мышалава—невялікі. Ён нарадзіўся за два гады да рэвалюцыі 1905 году, у рабочай сямʼі. Голад і жабрацтва прымусіла з раньняга ўзросту ісьці на працу, на шчацінную фабрыку ў горадзе Гомелі, дзе прапрацаваў шмат год. Стары камсамолец, Мышалаў у 1926 годзе ўступае ў КП(б)Б.

— Значыцца рэкамэндуеце т. Мышалава ў члены праверкому?—запытаўся ў прысутнічаючых тав. Кірылаў.

— Так,—адказалі шматлікія галасы.

* * *

Камісія правярае другую кандыдатуру ў праверком т. Бухбіндэр—культработніка фабкому.

І калі апошняя скончыла расказваць свой уласнажыцьцяпіс, пачуліся некалькі галасоў, жадаючых высказацца супроць кандыдатуры т. Бухбіндэр.

— Культпрацы амаль ня бачна на камбінаце, не кажучы ўжо аб прыгараднай гаспадарцы, куды т. Бухбіндэр забыла дарогу. Ня гледзячы на тое, што ў нас маецца вялікая колькасьць малапісьменных рабочых і работніц, апошнія не ўцягваюцца ў навучаньне,—гаворыць т. Мэзьер—рабочы мэханічнага цэху.

Аб працы тав. Бухбіндэр высказаліся яшчэ некалькі чалавек. І ўсе сказалі, што Бухбіндэр—дрэнная камуністка.

У даным выпадку бюро парткалектыву камбінату вельмі ня ўважліва падыйшла да кандыдатуры Бухбіндэр, калі рэкамэндавала яе ў члены праверкому.

З ПРЫЧЫНЫ ЗАЦЯЖКІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ПА ВІЦЕБСКІМ РАЁНЕ, ПРЫЗНАЧАНЫ НА 5 ЧЭРВЕНЯ ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ АДКЛАДВАЕЦЦА. АБ ДНІ СКЛІКАНЬНЯ БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЁНА.

ВІЦЕБШЧЫНА—КАНДЫДАТ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ.

КУЛАК І ЯГО АГЕНТУРА Ў БАБІНІЦКІМ, В.-ЛЁТЧАНСКІМ, СТАРАСЕЛЬСКІМ, І РУДАКОЎСКІМ СЕЛЬСАВЕТАХ ЗРЫВАЮЦЬ СЯЎБУ ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ.

НАНЕСЬЦІ РУЙНУЮЧЫ ЎДАР ПА САБАТАЖНІКАХ СЯЎБЫ, ПА ІГНАРУЮЧЫХ ЗАЎТРАШНІХ КАЛГАСЬНІКАЎ

ХОД СЯЎБЫ ПА РАЁНЕ
па становішчы на 2 чэрвеня 1933 году.

(У процантах)

НАЗВА СЕЛЬСАВЕТАЎ.	Разам.	У тым ліку.	
		Калгасы	Адпаасобнікі.
Міхалёўскі	74,9	85,9	52,9
Замастоцкі	69,6	76,0	49,5
Машканскі	69,2	79,8	73,3
Ялагінскі	64,7	85,8	67,0
Бараўлянскі	64,5	68,5	35,0
В.-Лётчанскі	62,9	77,0	44,0
Віцебскі	62,8	64,3	77,5
Шумвянскі	60,6	66,4	49,2
Сялюцкі	59,2	74,0	52,5
Мікалаёўскі	57,6	72,5	38,9
Бабініцкі	57,1	70,6	28,9
Старасельскі	52,5	62,5	32,4
Рудакоўскі	44,5	46,7	41,7
Рудніцкі	42,1	50,6	23,1
Даўжанскі	41,9	39,0	21,2
Разам па раёну	58,7	67,4	42,6

УВАГА: Калгасы раёну дзейнасьці МТС выканалі плян сяўбы на 71,4 проц., саўгасы выканалі 62,6 проц. пляну.

КІРАЎНІЦТВА ПА ЯХНІЧУ.

У кожным нумары шматтыражкі Рудакоўскага сельсавету мы чытаем аб тым, што аднаасобнікі вёскі Ваяводкі (член сельсавету Рагажынская Ірына) ва зрыў сяўбы занесены на чорную дошку.

Сельсаветам да гэтай вёскі прымацаваны брыгадзір з гораду т. Яхвіч. Замест таго, каб правадзіць масавую работу па мабілізацыі аднаасобнікаў на ліквідацыю прарыву ў сяўбе, Яхвіч бяздзейнічае. Ён патрабуе ад члена сельсавету, каб той даў яму кватэру, добра паесьці. Потым ён пойдзе на беразе возера і ўвечары пойдзе на вечарынку.

Тэрмінова трэба адклікаць „курортніка“ Яхвіча з сельсавету і прыцягнуць яго да адказнасьці.

Б. Паўлоўскі.

ДА АДКАЗНАСЬЦІ САБАТАЖНІКАЎ СЯЎБЫ.

СТАРАЕ СЯЛО.

На раду з працоўнымі аднаасобнікамі, добрасумленна праводзячымі сяўбу яравых культур, па Старасельскім сельсавеце маюцца і такія пункты аднаасобнікаў, дзе кулацкі сабатаж сяўбы зьліўся ў даволі шчыльнае гняздо. Па вёсцы Шлунты аднаасобнікі: Лебедзеў С і Лебедзеў Ф. атрымалі плян сяўбы па 4 га яравых. Яны катэгарычна адмовіліся выконваць плян, разбазарылі насеньне. Па вёсцы Мігава Шпынкоў І. павінен засеяць ячменю 1,25 га, аўсу 1,75 га, бульбы 0,6 га і іншых культур 2,1 га. Ён разбазарыў насеньне, а нядаўна прадаў і каня, каб ня выконваць пляну сяўбы.

Аднаасобнік Сінічын М. сабатуе выкананьне дадзенага яму пляна. Цікава адзначыць, што Сінічын М. з іншымі аднаасобнікамі, якія сабатуюць сяўбу, знайшлі сабе прытулак на пабудове дарогі ў прараба Віліна, які прымае на работу сабатажнікаў сяўбы і кулацкія элементы.

Неабходна безадкладна кулацкіх сабатажнікаў сяўбы прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці, а сярод працоўных аднаасобнікаў разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу за хутчэйшае завяршэньне сяўбы.

І. Іофэ.

ЗЛАЧЫННАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ.

Аднаасобны сэктар В.-Лётчанскага сельсавету ганебна адстае па сяўбе. Прымацаваныя працаўнікі ад сельсавету і партыйнай ячэйкі да асобных пунктаў Чарняўскі, Хаткоўская, Хуцкая, Германенка і іншыя нічога ня робяць, нават, ня бываюць на пунктах. Напрыклад, гэтым прымацаваным на пунктаў сельсаветам было даручана праверыць колькі аднаасобнікі засеялі, але ж яны замест абмеру выехалі ў Віцебск „пагуляць“.

Парт'ячэйка і яе сэкратар Філончык бяздзейнічаюць Ніякіх захадаў ня прымаецца да тых работнікаў, якія сваёй бяздзейнасьцю зрываюць веснавую сяўбу.

Рыг. Васільлеў.

Чорная дошка
сельсаветаў, калгасаў і вёсак, ганебна зрываючых сяўбу, ігнаруючых дырэктывы партыі і ўраду аб падняцьці ўраджайнасьці.

Даўжанскі сельсавет—старшыня сельсавету Гудаў, сэкратар парт'ячэйкі Гарадзенкі упаўнаважаны гаркому па калгасе «Сілач»—Бантаровіч.

Фабрыка „Дзьвіна“—шэф Даўжанскага сельсавету

Калгас „В. Чэрніца“, Замастоцкага сельсавету—старшыня Карчэўскі.

Дэпо Паўн.-Зах.—шэф калгасу „В. Чэрніца“.

Калгас імя Леніна, Бараўлянскага сельсавету—старшыня Чэпеленка.

Калектыў Водаканалу—шэф калгасу імя Леніна

Рудніцкі сельсавет: старшыня сельсавету—Міхееў, сэкратар парт'ячэйкі—Рудакоў. Упаўнаважаны ГК па калгасе імя Войкава—Брыкаў.

Шэфы калгасаў Рудніцкага сельсавету—сьпіртзавод, фабрыка гнутай мэблі, Белэнэрга, саюз грамадзкага харчаваньня, арцель «25 кастрычнік».

Рудакоўскі сельсавет: старшыня сельсавету—Кэрбель, сэкратар парт'ячэйкі—Мінаноў, упаўнаважаны ГК—Зіноўеў.

Фабрыка «Прафінтэрн»—шэф сельсавету.

ДАДАТКОВА ЗАНОСЯЦЦА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ

Старасельскі сельсавет — старшыня Аржаноўскі, сэкратар—Саламонік, упаўнаважаны ГК—Гарэлік.

Шэфы калгасаў сельсавету скурзавод і інструментальная фабрыка.

Калгас імя Чарвякова, Віцебскага сельсавету—старшыня Дзітлёнак, сэкратар парт'ячэйкі калгасу—Сысоеў.

Шэф калгасу—фабрыка імя Клары Цэткін.

ВЫРАЖ І ЗАХАВАЙ.

У дапамогу брыгадзіру паляводчай брыгады

Абавязковыя аграправілы па апрацоўцы папараў, зацьверджаныя Наркамземам БССР.

Усе папары ў гэтым годзе павінны быць разьмешчаны ў адпаведнасьці з устаноўленым і зацьверджаным райЗА севазваротам.

Пад чыстыя папары павінны вылучацца найбольш засьмечаныя вучасткі з тым, каб належнай апрацоўкай атысьціць іх ад пустазельля.

І. АПРАЦОЎКА ЧЫСТЫХ ПАПАРАЎ.

1. Ворыва чыстых папараў павінна вытварацца зараз жа пасьля сканчэньня сяўбы ранніх яравых культур і закончана не пазьней 10 чэрвеня.

2. Ворыва неабходна вытварацъ на поўную глыбіню пахатнага пласту у 12—15 см., але так, каб ня вывернуць на паверхню падпахатнага равей не апрацоўваўшагася пласту глебы. Замена першага асноўнага ворыва плугам іншымі відамі апрацоўкі, як дыскаваньне, пружынаваньне і г. д. катэгарычна забараняецца

3. Глыбіню ворыва неабходна ў вызначаных межах (12—15 см) рэгуляваць у залежнасьці ад ступені засьмечанасьці глебы і віду пустазельля. На глебах, засьмечаных пустазельлем, якое развіваецца карнявішчамі, глыбіня ворыва рэгулюецца ў залежнасьці ад глыбіні залягання карнявішч з тым, каб вывярнуць на паверхню аснаўную масу карнявішч.

4. Пасьля ворыва папару неабходна заразжа ўтварыць баранаваньне ў 2—3 сьляды. Выбаранаваныя карнявішчы і сьцяблы пустазельля неабходна зьбіраць у кучы, высушваць і спальваць.

5. Папар увесь час да пасеву павінен падтрымлівацца чыстым ад пустазельля і пухкім

6. Для падтрыманьня папару у чыстым і пухкім становішчы неабходна на працягу лета правесьці 2—3 разы апрацоўку глебы на глыбіні 6—8 сант. культіватарамі, ці лушчыльнікамі.

7. Не дапускаецца культівацыя дыскавымі культіватарамі глебы засьмечанай пустазельлем, якое размнажаецца карнявішчамі, бо пры дыскаваньні карнявішчнае пустазельле ня толькі ня зьнішчаецца, а наадварот яшчэ больш распаўсюджваецца

8. Першую культівацыю неабходна правесьці праз 2—3 тыдні пасьля ўзорваньня папару з мэтай зьнішчэньня ўсходаў пустазельля і пульхненьня верхняга пласту глебы.

9. У далейшым, культівацыя павінна праводзіцца па меры зьяўленьня на папары пустазельля, якое неабходна зьнішчаць абавязкова да пачатку цьвіценьня, ні у якім разе не дапускаць разрастаньня пустазельля на папару і тым больш яго абсемяненьня. Культівацыю папару засьмечанага карнявішчным пустазельлем трэба праводзіць 3—4 разы на працягу лета.

10. За 2—3 тыдні да сяўбы азімы неабходна зрабіць двойку (перавораваньня) папару на поўную глыбіню. Следам за двойкай правесьці баранаваньне.

11. Гной трэба ўвасіць перад першым ворывам папару ў першую чаргу пад азімую пшаніцу. Адразу пасьля вываскі гной неабход на раструшваць і заворваць. Застаўленьне на полі вывезенага гною не раструшаным і не завораным звыш аднаго дню забараняецца.

12. Торф трэба ўнасіць перад першым асноўным ворывам папару ў колькасьці 36 тон на адно га. Для тарфаваньня трэба скарыстоўваць добра праветраны (на працягу ня менш 6 ці месяцаў) разлажыўшыйся торф. Можна ўнасіць адзін торф, торф перамешаны гноем, торфафасфарытныя і торфавапнавы кампосты.

13. Кіслыя глебы неабходна вапнаваць. Вапна ўносіцца перад першым ворывам папару і задзелваецца пружыноўкай ці бараной у 2—3 сьляды. Дапускаецца рассеў вапны пасьля ворыва папару з задзелкай бараной 2—3 сьляды ў напярэк пластоў.

14. Пры ўнясеньні гною і вапны, лепш задзелку іх рабіць асобна. Сумесная задзелка дапускаецца пры ўмове рассеву вапны по раструшанаму на полі гною з безадкладным заворваньнем

15. Фасфарытную муку трэба ўнасіць пад азімыя ў колькасьці ня менш 6 цэнтнераў, на пры першым ворыве папару, і пры дваеньні а вак не пазьней як за 10—15 дзён да сяўбы. Пры ўнясеньні фасфарытнай мукі перад першым ворывам неабходна рабіць задзелку пружыноўкай ці бараной у 2—3 сьляды. Пі рассеве фасфарытнай мукі пасьля ворыва задзелка вытвараецца бараной, якую трэба пускаць у поперак пластоў у 2—3 сьляды.

16. Калі на полі равей унасілася фасфарытная мука, то вапна можа быць унесена гэта поле толькі праз 1—2 гады пасьля ўнясеньня фасфарытнай мукі. Фасфарытная мука на вапнаваныя палі можа быць унесена пр 2—3 гады пасьля вапнаваньня.

2 АПРАЦОЎКА ЗАНЯТЫХ ПАПАРА

1. Найбольш прыдатнымі для сяўбы ў папары культурамі зьяўляюцца: мяшанкі на лёны корм і насеньне (віка аўсяная, пялюш аўсяная, гарох аўсяны), раньняя бульба, розныя культуры, высадкі кораньплодаў, мень.

2. Догляд за занятымі папарамі праводзіцца у адпаведнасьці з відам паразаймаю расьліны. Праваныя паразаймаючыя культуры неабходна увесь час падтрымліваць чыстымі пустазельля з пульхлымі міжрадзьдзямі. Бу неабходна абсышаць ня менш 2-х разоў пачатку цьвіценьня.

3. Уборку паразаймаючых культур і ворыва пад азімыя неабходна правесьці не пазьней за 10—15 дзён да сяўбы азімых культур.

4. Ворыва трэба рабіць на поўную глыбіню (12—15 сант.) з пасьляпоўным баранаваньнем у 2—3 сьляды. Усе рэшткі паразаймаючых расьліны і пустазельля пры баранаваньні вінны выбірацца ў кучы і звазіцца з поля кампосныя кучы ці спальваецца.

„НАМ ТОЛЬКІ-Б ВЫЦЯГНУЦЬ КАЛГАСЫ“...

БАБІНІЧЫ (ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

На агульным фоне зрыву ўсіх партыйна-ўрадавых тэрмінаў сяўбы, аднаасобны сэктар цягне крывую выкананьня пляну па сельсавеце ўніз. На сёньняшні дзень ніводная вёска ня скончыла сяўбы.

У зрыве сяўбы па аднаасобным сэктары вінаваты парт'ячэйка і прэзыдыум сельсавету. У Бабінічах аднаасобніка скінулі са шчатоў.

Сэкратар ячэйкі Міхайлаў заяўляе: „нам толькі-б выцягнуць калгасы, а аднаасобнікі ў момант засеюць“. Яго словы не разыходзяцца са «справай».

Усе камуністы, якія прымацаваны да калгасаў, павінны кіраваць сяўбой па аднаасобных пунктах. Але гэтага няма. Міхайлаў напрыклад, прымацаваны да калгасу імя Молатава. На тэрыторыі гэтага калгасу знаходзяцца вёскі Маталыжыны, Бабінічы і Пушча. Гэтыя вёскі толькі нядаўна пачалі сеяць. Трэба дадаць, што гэтыя вёскі знаходзяцца пад носам у сельсавета. Астатнія камуністы кіруюць ня лепш Міхайлава. Вось галоўная прычына такога ганебнага адставаньня аднаасобнага сэктара.

Вучот ходу сяўбы па аднаасобным сэктары пастаўлены вельмі дрэнна. Члены сельсавету ўпарта не прадстаўляюць зводак, а калі і прадстаўляюць, то нічога нельга зразумець з гэтых зводак. Старшыня сельсавету Янушэвіч па гэтаму поваду многа гаварыў, але не прыняў канкрэтных захадаў, каб прымусіць членаў сельсавету кіраваць сяўбой у сваіх пунктах, рэгулярна прадстаўляць зводкі.

Са злачыннай недаацэнкай аднаасобнага сэктара павінна быць рашуча пакончана. Трэба моцна ўдарыць па канкрэтных вінавайцах ігнараваньня аднаасобніка.

Левінтаў

Б. ГУІМАН.

АБ СТАРАСЕЛЬСКІХ „КІСЕЛЯХ“ І ПАГЛЫБЛЯЮЧЫМСЯ ПРАРЫВЕ.

За ганебнейшае адставаньне, больш таго—за прамы зрыў сяўбы Старасельскі сельсавет шмат часу красаваўся кандыдатам на чорную дошку. У апошнюю пяцідзёнку сельсавет здаў сваё «кандыдацтва», зрабіўшыся паўнапраўным і заслужаным «членам» чорнай дошкі зрыўшчыкаў сяўбы. І гэта не выпадкова. Гэта вынік таго, ЯК у Старым Сяле кіруюць сяўбой. Гэта вынік не выпадку, а сыстэмы, ганебнейшай сыстэмы, дрэннага кіселя—абразнага небальшавіцкага кіраўніцтва сяўбой.

Вось тут мы і хочам даць некалькі характэрных рысаў гэтага кіраўніцтва і наогул становішча з сяўбой у Старым Сяле.

* * *

Перш за ўсё аб тэрмінах. Прахлопаўшы тэрміны раньняй сяўбы, сарваўшы выкананьне пляну сяўбы ва ўрадавых тэрміны, у Старым Сяле пачалі ўстанаўліваць свае новыя сельсавецкія тэрміны.

Тэрмін—непраменны спадарожнік сацыялістычнага пляну, без яго мы ня можам абыйсьціся, і таму ня дрэнна, што ў Старым Сяле займаюцца тэрмінамі, але справа ў тым, ЯК займаюцца.

Далёка ня пойдзем. 29 мая адбылася шырокая нарада актыву. Прысутнічала каля 70 чалавек. На нарадзе стаялі пытаньні: 1) інфармацыя аб адбыўшайся ў гаркоме нарадзе; 2) аб тэлеграме тав. Шаранговіча. Пытаньні сур'ёзныя. Доўга абгаварвалі. Шмат спрачаліся. Е ратка пастанавілі (гэта надрэнна, што коратка)—скончыць сяўбу на сельсавету да 1 чэрвеня, на працягу аднаго дню перайсьці на індывідуальную зьдзельшчыну ў калгасах, кой-што запісалі аб якасьці (не канкрэтна, а наогул—«змагацца»), кой што аб пасьцы і крыху агульных фраз, накшталт вітаем, абавязваемся, заклікаем і г. д.

А зводка аб ходзе сяўбы па сельсавету на гэты дзень сухой, але жорсткай у сваёй ганебнай сапраўднасьці мовай гаварыла, што плян сяўбы выкананы на 42 проц, што засталося не ўзьнятага ворыва каля 500 га і больш 1000 га не абсемянёнай плошчы.

Коняй усіх у калгасах сельсавету 194. Аб наяўнасьці коняй па аднаасобнаму сэктару ў сельсавеце ня ведаюць—«трэба падлічыць»,—кажа статыстык Баброў. Але нават, калі узяць разразунак прыблізныя падлікі Баброва, якія кажуць, што ў аднаасобнікаў сельсавету маецца прыкладна 60—70 коняй, значыцца ўсё ко^нс^кае пагалоўе сельсавету 250—270 галоў.

Значыцца, рашыўшы за два дні скончыць сяўбу, нарада „пастанавіла“ аднаму чалавеку з канём у дзень засеяць 4 га і акраям гэтага яшчэ 2 га ўзьнятага ворыва. Вось гэта тэмпы! Праўда, запаздалыя, але ўсё-жа „тэмпы“, вартыя кіраўнікоў сяўбой у Старым Сяле.

А на заўтра, кіраваўшы 29 мая нарадай упаўнаважаны ГК тав. Гарэлік у калгасе „Новае жыцьцё“ устанавіў тэрмінам сканчэньня сяўбы... 4 чэрвеня. Прыблізна таксама зрабілі і ў астатніх калгасах.

Гэта жывы сьвежы прыклад... І гэтакіх у Старым Сяле было шмат. Устанаўлівалі тэрміны сяўбы на ўрачыстым пленуме, прысьвечаным 1 му маю, на нарадах старшынь калгасаў, на пасяджэньнях пасеўкому і прэзыдыумах сельсавету. А ці гэта не прамая дыскредытацыя нашага пляну? Ці гэта не на карысьць кулаку, у мэтах якога сарваць сяўбу, калі устаноўленых тэрмінаў можна не прытрымлівацца? А не прытрымлівацца сельсавецкіх тэрмінаў і махаць на іх безадказнай рукамі ў Старым Сяле ўжо ўвайшло ў звычай.

* * *

17 мая нарада старшынь калгасаў пастанавіла ўключыцца ў пяцідзёнік штурму. Уключаючыся пастанавілі: «старшыням калгасаў зараз жа расставіць сілы, разьмеркаваць коняй, намеціць канкрэтны плян па пяцідзёньніку штурму»... Гэта у Старым Сяле называюць «канкрэтным» кіраўніцтвам! Тут-жа на нарадзе рашылі прымацаваць настаўнікаў да пунктаў аднаасобнага сэктару і прапанавалі ім «падагнаць аднаасобны сэктар у сяўбе і членаў сельсавету—ў дачы зьвестак»(!?).

Вывады яскравыя! За сяўбу ў аднаасобным сэктары у Старым Сяле адказваюць толькі настаўнікі. Дырэктыва ім дана чоткая—падагнаць аднаасобны сэктар у сяўбе. А члены сельсавету замест кіраўніцтва сяўбой, як прадстаўнікі савецкай улады на вёсцы, пастаўлены толькі для таго, каб даваць зьвесткі ў сельсавет.

9 мая на прэзыдыуме сельсавету стаяла справаздача старшыні калгасу «Другая пяцігодка» Глушакова. Адзначыўшы правал сяўбы ў калгасе, сельсавет прапанаваў Глушакову выканаць плян сяўбы ў вызначаны сельсаветам тэрмін (які гэта тэрмін, і чаму ён вызначаны сельсаветам, калі ёсьць тэрміны вызначаныя ЦК партыі і СНК), прапанавалі яму «паставіць дысцыпліну на доўжную вышыню», „правесьці правільную расстаноўку рабочай сілы, патрабуючы выкананьня норм выпрацоўкі“. А ці нельга было тут-жа на прэзыдыуме дасьвядчана і точна сказаць калгасу, як трэба расставіць сілы? Ці нельга было паказаць на факты патураньня зрыўшчыкам працоўнай дысцыпліны (а іх у калгасе «Другая пяцігодка» шмат)? І чаму гэта выкананьне норм выпрацоўкі трэба толькі патрабаваць, забываючы аб працадні, аб левінскім прынцыпе—хто больш працуе, той больш і атрымлівае? І гэта ў Старым Сяле прымаюць за чыстую манету «канкрэтнага» кіраўніцтва!

Правал тэрміну сяўбы не дае нікага права забываць аб якасьці. Калі аб тэрмінах ў Старым Сяле гаварылі і гавораць вельмі многа, то якасьцю зусім не займаюцца. У калгасе «Новае жыцьцё», у брыгадзе Лебедзева Якава, сеючы па заблыву бульбу, зямлю ня мяшалі, а толькі заскарадзілі—і ў ёй засталося шмат дзёрну, бульбу дрэнна задзелалі ў зямлю і шмат яе засталося на паверхні. У брыгадзе Максімава Кірылы, калгасу імя, 1 мая 10 га аўсу засталося не заскародженым.

* * *

Тэмпы, якімі сеюць у Старым Сяле кажуць аб наяўнасьці прамога кулацкага сабатажу веснавой сяўбы. Спрабавалі, быццам, зламіць гэты сабатаж. Вось, для прыкладу, аддалі пад суд старшыню калгасу «Другая пяцігодка» Глушакова, але яго ўсё яшчэ не судзілі і ён працягвае заставацца на чале калгасу і ў радох партыі. Тое-жа і з аддадзенымі пад суд брыгадзірам Лебедзевым і трымя аднаасобнікамі: справы заведзены, але іх ня судзілі. І за ўвесь час пасеўнай ніводзін з сабатажыкаў сяўбы ў Старым Сяле не асуджаны.

А вось, для прыкладу, некалькі сабатажнікаў, аб якіх ведаюць і самі расказваюць і ўпаўнаважаны ГК т. Гарэлік і сэкратар парт'ячэйкі Саламонік: Трынко Паўла з вёскі Чырына прадаў каня, сымулюючы пакражу яго, не абсемяненае сваёй плошчы, праводзіць шалёную агітацыю супроць сяўбы; Чарняўскі з вёскі Поніці прадаў каня, сам ня сее і арганізоўвае кулацкі сабатаж сяўбы; Іваноў Хведар з вёскі Касьцюкі прадаў каня, ня толькі ня сее, але нават яшчэ і арэць не пачаў. Бяздзейнасьць сельсавету дае поўную магчымасьць кулаку і яго агэнтуры арганізоўваць сабатаж сяўбы.

Старасельскі сельсавет не дае адчуваць таго, што ён—орган дыктатуры пралетарыяту і гэтаму мы многім „удзячны“ старшыні сельсавету Аржаноўскаму, які не кіруе сельсаветам, не кіруе сяўбой, які ператварыў сельсавет у вешта кіселяпадобнае. Апарат сельсавету разьвінчаны. Вельмі дрэнна працуе сэкратар сельсавету Казлоў. Статыстык сельсавету Баброў заблытаў увесь вучот і ўсю статыстыку.

* * *

Ёсьць у Старым Сяле партыйная ячэйка. Яна налічвае 20 членаў і кандыдатаў партыі. Вось яе склад: старшынь калгасаў 5, брыгадзіраў 3, радавых калгасьнікаў 5, намесьнік старшыні 1, астатнія—сэкратар парт'ячэйкі, старшыня і сэкратар сельсавету, старшыня сельСТ, загадчык плембазы і кіраўнік сплаўнога вучастку.

Камуністы ў калгасах Старага Сяла не забясьпечваюць сваёй авангардай вядучай ролі. Больш таго некаторыя з іх страцілі свой твар камуніста, зрывам веснавой сяўбы паставілі сябе ў пазыцыю здраднікаў партыйнай справе.

Максімаў—кандыдат партыі, брыгадзір паляводчай брыгады калгасу імя 1 мая, правальвае сяўбу ў брыгадзе. 2 тыдні назад бюро заслухоўвала Максімава, сказала яму як работаць. Але і гэтыя прапановы бюро Максімаў праваліў (дарэчы, бюро не праверыла выкананьня ім сваёй пастановы).

Голікаў—старшыня калгасу «Тружанік». Калі яму сакратар ячэйкі казаў аб тым, што трэба сеяць, ён адказаў: „Дай мне, Саламонік, расьпіску аб тым, што калі прападзе пасеў і я не адказваю, тады я буду сеяць“. Так разважае „камуніст“! Ён, Голікаў, ня турбуецца за партыю, ён ня лічыць сябе адказным за агульна партыйную справу, яму трэба „расьпісачкай“ застрахаваць сябе, каб ня несьці адказнасьці. І зараз Голікаў павінен адказаць перад партыяй і ўладай за зрыў сяўбы ў калгасе.

Урублеўскі—брыгадзір садова-гародняй брыгады калгасу „Новае жыцьцё“. Наўпрокі пляну і паказаньням сельсавету засеяў у парніках толькі рассаду і зусім не засеяў раньняй гародніны. Сяўба ў брыгадзе правальваецца, а Урублеўскі бегае, шуміць, мітусіцца, па сутнасьці-ж нічога ня робіць. Неаднаразова выклікалі Урублеўскага на бюро ячэйкі, але ён не зьяўляўся і бюро на гэтых «выкліках» супакоілася.

Максімава больш году выключана з партыі за адрыў і страту твару камуністкі, але да гэтага часу яна чамусьці ўсё яшчэ трымае кандыдацкі білет і ім прыкрывае сваю разлагацельскую варожую дзейнасьць у калгасе „Тружанік“.

Гэтым не канчаецца сьпіс «камуністаў» ячэйкі Старасельскага сельсавету, страціўшых свой клясавы палітычны твар. Аб гэтых «камуністах» гавораць, пацісканюць плячыма... супакойваюцца. Ні да аднаго з іх, уплоць аддадзенага пад суд Глушакова, ніякіх мер партыйнага спагнаньня не прынята. Як гэта падобна да кісяля!

Ёсьць у Старасельскім сельсавеце 4 камсамольскіх ячэйкі—2 калгасных, адна ў школе і адна ў сямігодцы. Усяго камсамольцаў больш 50 чалавек. Але камсамольцы мабілізаваны на ўдарную работу па сяўбе.

* * *

Яшчэ некалькі фактаў—раскіданых, а фактаў, якія нельга абыйсьці.

У калгасе „Новае жыцьцё“ дзялілі хлеб дзялілі яго не па працаднёх, а як кажуць сямі калгасьнікі: хто змог „выпрасіць“.

У большасьці калгасаў вельмі дрэнна пастаўлены вучот. У калгасах «Новае жыцьцё» „Тружанік“ і „Камунар“ яшчэ не выдаецца калгасьнікам на рукі прапоўныя кніжкі, увесь час сяўбы працадні не занесены ў кнікі і таму калгасьнікі ня ведаюць, колькі яны выпрацоўваюць. Брыгадзір Лебедзеў (калгас „Новае жыцьцё“) зусім згубіў запісы працадзеяў і зараз нельга ўстанавіць хто колькі выпрацаваў.

Брыгадзір Максімаў калгасу «Тружанік» мая замест таго, каб ліквідаваць прарыў у сяўбе, запрог лепшага каня, які ацэнены ў 1.5 рублёў, і паехаў прывазіць са станцыі прыехаўшую сястру жоны.

Гэтыя некалькі фактаў зьяўляюцца характэрнымі для калгасаў сельсавету.

* * *

Малюнак будзе ня поўны, калі не сказаць некалькі слоў яшчэ аб упаўнаважаным ГК тав. Гарэліку. Мы ўжо гаварылі аб тым, што ён ведае, калі калгасьнікі выходзяць на працу, ён „выходзіць на працу“ а 9 гадзін раніцы. Сьвятам было ў сельсавеце, калі Гарэлік адраз за ўвесь час веснавой сяўбы начаваў калгасе „Новае жыцьцё“. Вось гэта ўжо ўдак, а сыстэматычна ён увечары ідзе начаваць на лесазавод. Як-жа тав. Гарэлік канкрэтна практычна можа кіраваць сяўбой? Калгасьнікі кажуць аб тым, што на полі яго бачаць вельмі рэдка, калі ён прыходзіць у калгас я „дастаткова“ пабываць у праўленьні. Выходзіць, што і ўпаўнаважаны тут вельмі кісялепадобны.

* * *

Вось так у Старым Сяле „кіруюць“ бальшавіцкай сяўбой не па-бальшавіцку. Вось т нараджаецца і паглыбляецца прарыў.

Сталёвая бальшавіцкая партыя загартоўваецца яшчэ мацней.

З дакладу члена Цэнтральнай камісіі па чыстцы КП(б)Б тав. Сахаравай на сходзе актыву Віцебскай партарганізацыі 31 мая)*

...тварышы, згодна пастановы Цэнтральнага Камітэту і Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), мы прыступаем да чысткі ...ёў партыі.

...ая партыя, уваходзячая ў склад 2-га Інтэрнацыяналу, ня можа дазволіць сабе такой ...кую праводзіць наша партыя. Праўдзівы ...ы партыі, уваходзячыя ў склад 2-га Інтэрнацыяналу, падражаючы нам, камуністам, ...ць чысткі, але розніца паміж чысткай партыі і чысткамі іхнімі тая, што ...—чыстка з мэтай пазбавіцца ад ...ія трапілі ў рады гэтых здрадзікаў ...а, ці шляхам ашуканьня іх, і зараз з дню на дзень усё больш і больш навочна пераконваюцца, што сацыял фашысты—душагубы рабочых, верныя лёкаі капіталу. Яркім доказам гэтаму служыць сацыял-дэмакратыя Германіі—гэта самая, што ні на ёсьць здраднічая партыя, якая двойнічае шляхам ашуканства і алурманьваньня рабочых і працоўных мас, знаходзіцца на службе ў Гітлера. Гэта пры ...е актыўнай дапамозе Гітлер прыйшоў да ўлады. Рабочыя зараз бачаць куды вядзе германская сацыял-дэмакратыя, чые інтарэсы яна абараняе. Рабочыя масы з агідных спраў германскай сацыял-дэмакратыі, як нельга лепш, упэўніліся, што гэтыя лёкаі служаць Гітлеру, фашызму.

...АЧЫСЬЦІМ ПАРТЫЮ АД ШКОДНЫХ, ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ.

...ка партыі, у якую зараз мы ўступаем ...ая чыстка. Першая чыстка партыі ...ў праходзіла ў нас у 1921 годзе, та... мы ўвадзілі у вашай краіне новую ...ую палітыку. Другая чыстка партыі ...аведзена ў 1929 годзе, у пачатку пяцігодкі. ...льшавіцкай пяці одкі І, нарэшце, трэ...тка—гэта чыстка, якую наша партыя ...ць у гэтым годзе, першым годзе другой ...цкай пяцігодкі.

Савецкі саюз гіганцкі вырас. Посьпехі ...вялізарныя. Гэтыя посьпехі зараз бясспрэчна ня толькі для нашых прыяцяў, але іх аспарваць ня сьмеюць нават Савецкага саюзу. Буржуазія зараз ня ...ко адмаўляць тых вялізарных дасягненьняў, ...ія намі набыты у пераўтварэньні нашай ...ны сацыялістычны лад.

...Сахарава, у парадку ілюстрацыі гэтага ...ставе рад вытрымак з рэакцыйнай буржуазнай прэсы, якія служаць лепшымі сьведкамі ...ітто і буржуазія зараз вядзольна адмаўляецца ...ашых перамог.

Разам з ростам нашай сацыялістычнай ...ласьці,—працягвае т. Сахарава,—разам ...ваньнем новых і новых галінаў індуст...—фабрык і заводаў, расла, пашыралася, ...ым падта хуткімі тэмпамі, рабочая кляса. ...ам з рабочай клясай расла і наша ка...ычная партыя, вабраўшы ў сябе лепшых ...рабочае клясы. Але побач з лепшымі ...ўларнікамі вытворчасьці, побач з лепшымі сынамі рабочае клясы, у партыю ўвайшлі і такія людзі, якія бяз году тыдзень на вытворчасьці. Больш таго, і горш таго—у партыю пралязалі шкурнікі, кар'ерысцкія элемэнты, людзі з чорным мінулым, шкоднікі, ворагі дыктатуры пралетарыяту.

Ад клясава-варожых элемэнтаў, якія шляхам ашуканства пралезьлі ў партыю для таго, каб знутры яе разлагаць: ад двурушнікаў, якія прыкрываюць партыйным білетам свае варожыя справы і імкненьні, якія на словах клянуцца за генэральную лінію партыі, а на справе зрываюць ажыцьцяўленьне яе; ад шкурнікаў, кар'ерыстаў, буржуазных перараджэнцаў, бюракратаў, чыноўнікаў партыя за час чысткі павінна пазбавіцца самым рашучым чынам.

Начуваных посьпехаў мы дабіліся ў галіне сацыялістычнай перабудовы нашай сельскай гаспадаркі.

Разам з удымам сельскай гаспадаркі і пераводам яе на сацыялістычныя рэйкі, побач з ростам саўгасаў, калгасаў і МТС, растуць і ускладняюцца задачы сельскіх партыйных арганізацый—авангарда, кіраўніка сацыялістычнай рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі.

Між тым, ні для каго не сакрэт, што ў радзе месц на сяле мы сустракаліся з фактамі, калі нашы партыйныя ячэйкі бальшавіцкі не апраўдалі сябе, калі бальшавіцкая пільнасьць гэтых партыйных ячэек была прытуплена, а кулак, шкоднік, клясавы вораг, былыя белыя афіцэры, жандары і іншая зграя, скарыстоўваючы гэтую акалічнасьць, пралязалі ў калгасы, захоплівалі там камандныя вышыні, а потым раскрадвалі збожжа, шкодзілі, разбазарвалі калгасную маёмасьць і ўсялякімі спосабамі двойнічалі з тым, каб разбурыць нашы калгасы. І трэба ж прызнаць, што гэтая контррэвалюцыйная антысавецкая хэўра заваліла часта з посьпехам праводзіла свае справы. Чому? Таму, мяркуючы, што ў радзе ячэек і камітэтаў была страчана бальшавіцкая чуйнасьць, была прытуплена і страчана пралетарская пільнасьць.

Узьняць клясавую сьвядомасьць, павысіць пралетарскую пільнасьць і чуласьць, дамагчыся павышэньня ідэалёгічнага ўзроўню нашых партыйных ячэек і калектываў, выкінуць клясава-варожыя элемэнты, перараджэнцаў, бюракратаў, ворагаў з партыйнымі білетамі у кішэнях асноўная задача чысткі, да якой мы зараз прыступаем.

КАМУНІСТ АБАВЯЗАНЫ АЎЛАДАЦЬ МАРКСЬЗМАМ-ЛЕНІНІЗМАМ.

У радзе ячэек вусім ніякі палітычны ўзровень. Нярэдка наглядаецца поўная адсутнасьць марксыцка-ленінскага выхаваньня, а мы добра ведаем (бо нам неаднаразова гэта паказвалі нашы правадыры—т. Ленін і яго лепшы пасьлядоўнік т. Сталін), што без рэвалюцыйнай тэорыі ня можа быць рэвалюцыйнага рабочага руху, рэвалюцыйнай барацьбы. Партыя вядзе за сабой шырачэзныя масы і, значыць, яна павінна быць падрыхтаванай. Кожны камуніст, кожны член і кандыдат партыі павінен добра аўладаць марксыцка-ленінскай тэорыяй. Гэта, і толькі гэта, тэорыя асьвятляе шлях нашай барацьбы ў пабудове бесклясавага сацыялістычнага грамадзтва

На першых кроках нашай работы па правядзеньні чысткі мы мелі сустрэчы ўжо з нездаровымі думкамі і настроямі. Так, некаторыя спрабуюць разважаць: „Гісторыі партыі ня ведаю праграмы і статуту партыі не разумею, важнейшых рашэньняў партыі не прааботаў; ну, значыцца я—неправераны кандыдат на вычистку з радоў партыі, значыць, можна загадзя, не чакаючы пакуль мяне чысьціць пачнуць, здаць партыйны білет, ці кандыдацкую картку".

Гэткія думкі і разважаньні вусім шкодныя. Барацьба за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за выкананьне прамфінпляну, за высокія якасныя і колькасныя паказчыкі, за правядзеньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва—вось мерка, з якой партыя будзе падыходзіць да члена і кандыдата партыі пры правядзеньні чысткі. Адчак, і палітпатрыхтоўку неабходна праверыць, бо ёсьць партыйцы, якія не разумеюць лініі партыі, задач партыі.

«З прычыны таго, што сярод членаў партыі, уступіўшых за апошні час у рады Усесаюзнай камуністычнай партыі бальшавікоў, ёсьць частка таварышоў, адданых справе рабочае клясы і паказаўшых на справе—на вытворчасьці, у калгасах—сваю адданасьць, але не ўсвоіўшых самых элемэнтарных палітычных ведаў, неабходных для члена камуністычнай партыі,—праграмы, статуту, важнейшых пастаноў партыі, Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія партыі рэкамендуюць пры чыстцы пераводзіць такіх камуністаў у кандыдаты партыі, не ў выглядзе партспагнаньня, а ў мэтах іх палітычнага выхаваньня і лепшай падрыхтоўкі, з тым, каб праз год паставіць пытаньне аб іх пераводзе зноў у члены партыі, калі яны змогуць за гэты год павысіць сваю палітычную пісьменнасьць, неабходную для члена партыі.

З прычыны таго, што ў выніку тых жа абставін у складзе кандыдатаў партыі аказалася ня малая колькасьць таварышоў, якія ня толькі ня маюць элемэнтарных палітычных ведаў, неабходных для кандыдатаў, але страдаюць ясчэ вяўстойлівасьцю і засутнасьцю ўстарчальнай вытрымана сьцю з пункту погляду партыйнай дысцыпліны, Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія партыі рэкамендуюць пры чыстцы пераводзіць такіх таварышоў з разрада кандыдатаў у разрад спачуваючых, з тым, каб праз год паставіць пытаньне аб іх пераводзе зноў у кандыдаты, ці прыёме іх у члены партыі, калі праверка пакажа, што яны ўпаўне сазрэлі для гэтага». (З паст. ЦК і ЦКК аб чыстцы партыі).

Вось гэтыя мерапрыемствы і зьяўляюцца асаблівасьцю прадстаячай чысткі.

Наша партыя сільна вырасла за кошт камсамолу. Моладзь трэба выхоўваць. Трэба прыцягнуць і камсамол да правядзеньня чысткі, вучыць яго на гэтым.

АСАБЛІВАСЬЦІ ЧЫСТКІ У КП(б)Б.

Прыступаючы да чысткі партыйнай арганізацыі Беларусі, трэба сказаць, што ваша арганізацыя мае свае спэцыфічныя асаблівасьці.

Першая з гэтых асаблівасьцей, гэта тая, што вы знаходзіцеся на мяжы з фашыстоўскай Польшчай. Вам трэба быць асабліва пільнымі. Трэба ўмець адрозьніць, распазнаць ворага, а вы ведаеце, што клясавы вораг зьмяніў мэтады і спосабы сваёй барацьбы. Умець выкрываць гэтыя мэтады і тактыку клясава варожых элемэнтаў асноўная якасьць бальшавіка.

Другой асаблівасьцю вашай партыйнай арганізацыі зьяўляецца тое, што ў КП(б)Б параўнальна шмат выхадцаў з іншых партый, і гэтыя выхадцы з дробнабуржуазных партый ня малы ўплыў аказваюць на партыйныя ячэйкі, калектывы, асабліва на камуністаў, якія яшчэ не перавыхаваліся ў нашым бальшавіцкім духе.

Трэцяя асаблівасьць—гэта нацыянальныя моманты выцякаючыя з ранейшага становішча Беларусі пры царскім самаўладзьтве і разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва зараз.

Была я учора,—гаворыць т. Сахарава,—на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі»—гэтым віцебскім волапе...ным пяцігодкі. Запытвалася, ці ёсьць у вас на фабрыцы бундаўскія настроі і правы? Мне адказалі: „такіх настрояў і праяў не заўважаем". А я запытаю, таварышы: тое, што фабрыка сыстэматычна ня выконвае прамфінпляну, што сталоўка фабрыкі брудная, што на фабрыцы панує хаос, беспарадак, бесгаспадарчасьць, што прыгарадная гаспадарка яшчэ дагэтуль ня скончыла сеў,—ці-ж гэта не рэзультат дробнабуржуазнага кіраўніцтва? У гэтым, па сутнасьці, і хаваюцца абывательскія дробнабуржуазныя правы і настроі на фабрыцы.

Я запытваю: такое кіраўніцтва, якое мы маем на «Сьцягу», ці-ж яно мае што небудзь агульнае з той лініяй і з тымі задачамі, якія высоўваюцца перад намі нашай камуністычнай партыяй, яе ленінскім Цэнтральным Камітэтам, на чале з нашым любімейшым правадыром т. Сталіным?

«Тэорыя», што на вялікіх фабрыках і заводах абавязкова павінен быць беспарадак—буржуазная тэорыя. А між тым, гэтая „тэорыя" мае хаджэньне на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі».

Чыстка партыі павінна вымесьці буржуазных перараджэнцаў, якія нездольны на справе змагацца з клясавымі ворагамі, з кулацкімі элемэнтамі, рвачамі, лодырамі, парушыцелямі працоўнай дысцыпліны, дэзарганізатарамі вытворчасьці.

ЯК ПРАВЕСЬЦІ ЧЫСТКУ ПАРТЫІ.

У час чысткі павінна быць складзена таварыская абстаноўка: ня трэба задаваць праверэмым каверзных пытаньняў, ня трэба блытаць праверэмага. Трэба скласьці такую абстаноўку, каб за час чысткі вакол ячэек згуртаваліся яшчэ большыя масы рабочых і працоўных, а гэтага мы дабіёмся тады, калі разгарнём шырока бальшавіцкую самакрытыку, ня гледзячы на асобы.

За час чысткі неабходна наглядна перад масамі працоўных прадэманстраваць нашыя посьпехі, ускрыць недахопы, выявіць канкрэтных злачынцаў, выгнаць перараджэнцаў з радоў партыі. Трэба, каб за час чысткі мы ліквідавалі нашы прарывы ў галіне выкананьня прамфінпляну, узьняцьця якасьці прадукцыі, зьніжэньня сабекошту. Лепшым паказчыкам базвога пачатку чысткі партыі павінна стаць неадкладнае завяршэньне веснавой сяўбы.

Казусы, асобныя памылкі, якія магчыма будуць дапушчаны пры правядзеньні чысткі, нам неабходна будзе выпраўляць на ходу, пабальшавіцку.

Асаблівасьць чысткі гэтага году заключаецца яшчэ і ў тым, што для правядзеньня яе Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія склалі цэнтральную камісію для правядзеньня чысткі.

Чыстка 1921 году праводзілася праз спэцыяльна створаныя камісіі зьверху. У рэзультаце правядзеньня гэтай чысткі мы мелі скарачэньне нашай партыі на 30 проц. Чыстка 1929 году праводзілася праз сыстэму нашых кантрольных камісій. Кожная кантрольная камісія чысьціла тую арганізацыю, якой яна была выбрана. Пры чыстцы 1929 году мы мелі скарачэньне нашай партыі на 10 проц. Асноўным недахопам чысткі 1929 году зьяўлялася тое, што чыстку праводзіла арганізацыя, выбраная тымі членамі партыі, якіх яна чысьціла. І таму ясна, што ўсе нашы арганізацыі, близмоўна, знаходзіліся пад вельмі вялікім націскам усякіх мясцовых настрояў, інтарэсаў і мясцовых хваравітых зьявішч.

Чыстка гэтага году будзе праводзіцца накшталт чысткі 1921 году, г. зн. спэцыяльна створанымі камісіямі зьверху. Цэнтральная Камісія па правядзеньню чысткі складаецца з сталёвых бальшавікоў, загартаваных у рэвалюцыйных бойках супроць самаўладзьтва, гэта прафэсіяналы з падпольным партыйным стажам: тт. Рудзутак, Л. М. Кагановіч, Кіраў, Яраслаўскі, Шкіратаў, Яжоў, Стасава, Пятніцкі. Акрамя гэтага, складзены абласныя рэспубліканскія, раённыя камісіі. На гэтыя камісіі ўскладзена вялікая адказнасьць.

— Трэба дамагчыся,—заканчвае свой даклад т. Сахарава,—усю работу па правядзеньні чысткі паставіць так, каб з чысткі наша партыя выйшла яшчэ больш моцнай, маналітнай, спаянай, загартаванай, сталёвай, з павышанай бальшавіцкай пільнасьцю (бурныя аплёдысмэнты)

МЫ ВЫЙДЗЕМ З ЧЫСТКІ ТРОЙЧЫ ЎМАЦАВАНЫМІ.

*Зпрамовы т. Галадзеда на сходзе партактыва 31 мая *).*

— Агульнае палажэньне, выцякаючае з ...ставовы Цэнтральнага Камітэту і Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі партыі аб чыстцы ...ртыі,—гаворыць т. Галадзед,—досыць яскрава вызначыла т. Сахарава ў сваім дакладзе.

Наша партыя налічвае ў сваіх радох больш ...х мільёнаў чалавек. Наша партыя—дзяржаўная партыя, партыя, якая кіруе жыцьцём ...аіны, якая стаіць на чале ўсяго будаўніцтва. У сілу ўсяго гэтага, і прыймаючы пад ...агу яшчэ і тую акалічнасьць, што партыйкі на мясцох пры прыёме ў партыю не ...ўсёды падыходзілі строга, а асобныя арганізацыі практыкавалі нават прыём у партыю «пад ...іш», часта разам з ударнікамі, лепшымі ба...льбітамі, у партыю прабіраліся клясава-варожыя элемэнты, кулакі, «былыя» людзі.

Хлебазагатоўкі мінулага году паказалі, што ...ежная партыйная арганізацыі ёсьць перапоўнены ворагі з партыйнымі білетамі, ад ...іх неабходна партыі ачысьціцца.

Узьняць ідэалёгічны ўзровень, павысіць ...здольнасьць кожнай партыйнай ячэйкі—...явая задача, бо наша партыя кіраўнік, прадвадыр, арганізатар, прапагандыст, агітатар працоўных мас. А камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі яшчэ і лабавая арганізацыя, ...ваходзячаяся пры мяжы і гэта ўскладвае на ...ас асаблівую адказнасьць.

Многа ў нашых радох выхадцаў з другіх партый. Ня ўсе яны парвалі са сваім мінулым. Гэтыя выхадцы часам адмоўна, шкодна ўплываюць на асобных камуністаў і ячэйкі.

Наша КП(б)Б—маладая. Больш 90 проц.—гэта людзі, якія ўступілі ў партыю пасьля Кастрычніка і ня маюць закалкі падпольнай рэвалюцыйнай барацьбы царскіх часоў. Бальшавізацыя КП(б)Б—адна з неадкладных бавых спраў. Мы павінны вучыцца, моцна вучыцца, ...льшавізму.

...П(б)Б—зьяўляецца нацкампартыяй. Гэтую асаблівасьць нельга выпускаць. Трэба праверыць, сур'ёзна праверыць, як ячэйкі, калектывы і асобныя камуністы змагаюцца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі—адзнаго з асноўных зьвеньняў праграмы нашай партыі. Да гэтага нас абавязвае яшчэ і тое, што за апошні час мы мелі рад вылазак буржуазных нацыяналістаў (справа настаўніка Сьцяпуры), вылазак шавіністычных, бундаўскіх і інш.

У віцебскай арганізацыі з правядзеньнем нацыянальнай палітыкі ня ўсё ладна. На фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі" буржуазна нацыяналістычныя элемэнты разгарнулі сваю работу так, што з месяца ў месяц на фабрыцы зрываецца прамфінплян, якасьць нікудышная, браку шмат. А партыйная арганізацыя фабрыкі не вядзе рашучай барацьбы з гэтымі праявамі: партыйная арганізацыя фабрыкі налічвае 500 чал., многа тут камсамольцаў, а прамфінплян за апошні месяц выканан толькі на 35 проц. Дык ці ж гэта работа? Балбатняй „сьцягаўцы" падмяняюць канкрэтныя бальшавіцкія справы.

На «Чырвоным мэталісьце» камуністы дрэнна работаюць, затое на заводзе работаюць контррэвалюцыйныя элемэнты. Таварышы, ведайце, што вораг зьмяніў тактыку сваёй барацьбы. Ён зараз адкрыта на сходах не выступае. Вораг праводзіць свае агідныя контррэвалюцыйныя справы па за сходамі, уплоць да лазьні. Вось і нам, камуністам, трэба работу паставіць так, каб мы былі ўсюды, а то часам бывае, што камуністы знаходзяць лішнім гутарыць з асобным дзядзькам. —Карысьней,—думаюць яны,—выступаць на вялізных сходах, мітынгах. Вопыт работы паказвае, што такія думкі няверны.

Віцебская арганізацыя сустракае чыстку з вялікімі прарывамі ў выкананьні прамфінпляну, з вялікімі прарывамі ў веснавой сяўбе. Усё гэта павінна гучэць сур'ёзнымі матывамі для чысткі партарганізацыі Віцебшчыны. А ў вас жа,—гаворыць тав. Галадзед,—ёсьць узоры барацьбы за генэральную лінію партыі, Вось на фабрыцы «КІМ» брыгадзірам работае камсамолка, у мінулым бяспрытульная т. Норкіна. Брыгада Норкінай сыстэматычна перавыконвае плян. Замест «тэарэтычна ўзаконеных» трох процантаў браку, яе брыгада дае толькі 0,75 проц. Брыгада Норкінай перавыконвае норму на 35 проц. У чым справа? А справа ў тым, што Норкіна сапраўды лепшая ўдарніца, што ў яе брыгадзе добра расстаўлены сілы, што яна сур'ёзна аўладала тэхнікай. Норкіна—лепшая ўдарніца ўсёй трыкатажнай прамысловасьці Беларусі. Я пытаюся, ці-ж швейніцы са «Сьцягу» ня могуць работаць так, як работае Норкіна? Справа ў нас самых, справа ў жывых людзях. Упартае бальшавіцкае змаганьне—зарука перамогі. А вось такое змаганьне адсутнічае на раду віцебскіх прадпрыемстваў, і ў першую чаргу на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі.».

Беларусь у вясенняй сяўбе гэтага году ідзе лепш, чым у мінулых гадох, але наогул мы яшчэ сеем дрэнна. У тэрмін ня скончылі севу. А ў Віцебску гародняя сяўба ідзе з рук вон дрэнна. Разважаньнямі займаецеся і гэтым самым расхаладжваеце справу. Шмат хто ў вас тут не разумее значэньня прыгарадных гаспадарак. Прыгарадная гаспадарка заводу «Чырвоны мэталіст» мае усяго адну карову. Гэта-ж ганьба! Тады як прыгарадная гаспадарка менскага піваварнага заводу забясьпечвае свой завод малаком, бульбай і іншымі прадуктамі. Гэта гаспадарка даўно скончыла сяўбу. Чаму-ж прыгарадныя гаспадаркі заводу «Чырвоны мэталіст», «Сьцяг індустрыялізацыі» і інш. дагэтуль зацягваюць сяўбу? У час чысткі гэтага абыйсьці нельга. Спытаць, з прыстрасьцем спытаць, трэба будзе ў кіраўнікоў гэтых прадпрыемстваў, чаму яны ня кіруюць прыгарадныя гаспадаркамі?

Камісія ЦК і ЦКК УсеКП(б), вылучаная для чысткі КП(б)Б, забясьпечыць правільную лінію ў правядзеньні чысткі нашай арганізацыі. Камісія нам дапаможа выйсьці з чысткі тройчы ўмацаванымі і ў баявых і ў палітычных адносінах. (Бурныя аплёдысмэнты).

*) Па жывым запісе.

УЗЬНІМЕМ СВАЮ РАБОТУ НА ЯШЧЭ ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ.

З прамовы тав. Жаброускага на сходзе партактыва 31 мая,)*



— Беларуская партарганізацыя,—гаворыць т. Жаброўскі,—канкрэтна прыступае да чысткі сваіх радоў. Даны этап разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце, вялічэзныя задачы, якія павінны быць вырашаны ў перыяд другой пяцігодкі, яшчэ больш узмацнілі ролю партыі, як вядучага авангарду мільёнаў будаўнікоў сацыялізму. Гэта стварыла неабходнасьць у трэці раз ачысьціць рады нашай партыі ад усіх клясава-чужых, варожых элемэнтаў апартуністаў, двурушнікаў, якія на словах клянуцца „верасьці" генэральнай лініі партыі, а на справе ашукваюць партыю, перараджаюцца, кар'ерыстаў і парушыцеляў жалезнай дысцыпліны партыі і дзяржавы.

Чыстка партыі ў многім памножыць сувязь партыі з шырачэзнымі беспартыйнымі масамі. Гэтая праверка—баявая праверка партыі, яе гатоўнасьці змагацца і кіраваць сацыялістычным будаўніцтвам і пабудовай бесклясавага сацыялістычнага грамадзтва. У сувязі з гэтым выключна адказныя задачы стаяць перад ўсёй КП(б)Б і кожным камуністам паасобку.

Вы ведаеце, таварышы, што на нашу работу, на нашы перамогі і паражэньні глядзяць і вучацца на гэтым працоўныя Заходняй Беларусі у іх барацьбе з імі нацыянальнай і сацыяльнай прыгнечанасьці.

У КП(б)Б мы маем добрых праверэных таварышоў, прайшоўшых суровую школу барацьбы з ухілам у нашай партыі, барацьбы з царскім самаўладзьтвам, адданых партыі і савецкай уладзе. Разам з тым, у складзе нашых радоў маюцца выхадцы з Бунду, эсэраў, сіяністкіх арганізацый, сацыялістычнай беларускай грамады. Тут да гэтых таварышоў трэба падыходзіць асабліва ўважліва і пільна правяраць як яны сябе перавярылі, перавыхавалі за час знаходжаньня ў бальшавіцкай партыі. Асабліва ў Віцебску маецца цэлы рад таварышоў, якія састалі раней у іншых партыях, буржуазных нацыяналістаў, вялікадзяржаўных шавіністаў, нацдэмаў, вядучых барацьбу супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, пры гэтым прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам. У віцебскай арганізацыі маецца цэлы рад хвасьцішкіх і спажывецкіх настрояў. Усё гэта мы павінны выявіць і павесьці супроць іх рашучую барацьбу.

Віцебская партарганізацыя па сваім складзе і колькасным вазе павінна займаць вядучае месца сярод партарганізацый Беларусі ў барацьбе за гаспадарча-палітычныя мерапрыемствы, правадзімыя партыяй і ўрадам. А на справе атрымліваецца наадварот. Вазьмеце для прыкладу фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі», якая на працягу двух год ня выходзіць з глыбокага прарыву, прычым брак неймаверна расьце, што прыводзіць да неабходнасьці закрыць пэх паліто. Аналёгічнае становішча і на іншых прадпрыемствах.

Выключна дрэнна працуе віцебскі чыгуначны вузел, на якім асабліва за апошні час здарылася шмат аварый і паломак паравозаў. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што барацьба за стварэньне ўласнай харчовай базы ня стала ў цэнтры ўвагі партыйнай арганізацыі.

На лепш становішча абстаіць і ў сельскай гаспадарцы нашага раёну. Больш таго, на сёньняшні дзень ёсьць сур'ёзная пагроза зрыву сяўбы. Менск, Гомель, нават Магілёў ідуць значна ўперадзе Віцебску, а апошні агідна адстае. З гэтага відавочна выцякае і тое, што прадпрыемствы не аказваюць штодзённай дзелавой канкрэтнай дапамогі сельскай гаспадарцы, у прыватнасьці калгасам.

Буйныя прарывы мела і мае віцебская партарганізацыя ў галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Нацыянальная палітыка партыі ёсьць сустаўная, неадрыўная частка ўсёй генэральнай лініі партыі. Ва ўмовах нашай БССР барацьба на два фронты супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, і мясцовых шавіністаў—контррэвалюцыйных нацдэмакратаў, яўрэйскіх і іншых шавіністаў адыгрывае выключнае значэньне. Гэтая барацьба ёсьць барацьба супроць агалцелых клясавых ворагаў, якія адкрыта і скрыта хочуць падарваць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва БССР. Тая актывізацыя контррэвалюцыйных буржуазна-кулацкіх нацыяналістычных элемэнтаў, якая мела месца ў нядаўні час, тое ігвалтоўнае выдзекваньне і парушэньне асноў пралетарскага інтэрнацыяналізму з боку клясава-варожых нацыяналістычных элемэнтаў, якое выявілася таксама ў нядаўні час, паказалі, што мы павінны з яшчэ большай напружанасьцю, з усёй сілай сталёвых бальшавікоў дабіць да канца ўсялякіх шавіністаў і далей з яшчэ большымі перамогамі біцца за ленінскую нацыянальную палітыку. Віцебская партарганізацыя, як буйнейшая ў БССР, павінна быць у першых шэрагах барацьбітоў за тую вялікую праграму дзеяньняў і барацьбы, якая намечана сакавіцкім пленумам ЦК КП(б)Б. Трэба нанесьці руйнуючы ўдар па тых шавіністах, якія хочуць паслабіць нашу барацьбу за ўзьняцьцё на вышэйшую ступень разьвіцьця беларускай культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце, якія спрабуюць падарваць нашу барацьбу за пралетарскі інтэрнацыяналізм.

ЦК КП(б)Б намеціў разгорнутую праграму дзейнічаньня за ўмацаваньні ўнутрыпартыйнай работы. Гэтаму даў повад рад прарываў у паасобных буйных арганізацыях Беларусі, у прыватнасьці віцебскай, дзе, як вядома, па ўказаньнях «Правды», налічваецца больш 800 «мёртвых душ». Гэтыя прабелы ва ўнутрыпартыйнай рабоце мы павінны будзем ліквідаваць у парадку падрыхтоўкі да чысткі.

Таварышы, мы патрабуем ад камуніста, і правільна патрабуем, каб ён быў важаком у барацьбе за прамфінплян. А на віцебскіх прадпрыемствах рад камуністаў пазбегнулі ў хвасьце беспартыйных рабочых. Гэтаму прычынай, што сэкратары вытворчых ячэек, дырэктары ня выхоўваюць камуністаў у духу бальшавіцкай партыйнасьці.

Чыстка партыі скараціць колькасны ліквідацыі, але затое, яшчэ больш узмацніцца магутнасьць і маналітнасьць партыйных радоў.

*) Па жывым запісе.

АБМЕН ЗАЯВАМІ ПАМІЖ НКЗС І ЯПОНСКІМ ПАСЛОМ У МАСКВЕ п. ОТА.

26-га мая г. г. японскі пасол п. Ота перадаў наступны адказ японскага ўраду на заяву савецкага ўраду ад 16 га красавіка:

Пасьля ўзьнікненьня манчжурскіх здарэньняў, японскі ўрад у сувязі з пашырэньнем на Паўночную Манчжурыю дзеянняў японскай арміі неаднаразова рабіў заявы аб тым, што ён будзе адносіцца да правоў і інтарэсаў СССР на КУЧ з паважаньнем. На працягу здарэньняў як японскай арміяй, так і японскімі ўладамі і ў Манчжурыі, нягледзячы на ўсякага роду цяжкасьці ў ачышчэньні раёнаў Паўночнай Манчжурыі ад бандытаў, была ўдзел на магчымая ўвага для таго, каб не нанесьці страг інтарэсам КУЧ. Гэта зьяўляецца яркім фактам, які павінен быць улічан савецкім урадам у належнай ступені Тым ня менш, савецкі ўрад, лічачы, што дзеяньні ўл ды Манчжоў-Го, японскіх саветнікаў Манчжоў-Го і непасрэдна мясцовых японскіх улад у апошнія месяцы стварылі на КУЧ сур'ёзнае становішча, выклікаючае трывогу савецкага ўраду ня толькі па поваду парушэньня нармальнага функцыянаваньня дарогі, але і ў сувязі з тым, што гэтыя дзеяньні ставяць сваёй задачай абвастрэньне становішча на дарозе, зьвярнуўся да японскага ўраду з патрабаваньнем, каб былі прыняты эфэктыўныя меры, здольныя абараніць інтарэсы СССР, і паказаў на некаторыя пасобныя факты, па яго думцы, парушаючыя памянёныя інтарэсы.

У ліку паказаных савецкім урадам фактаў маюцца такія факты, якія належаць выключна да кампэтэнцыі ўраду Манчжоў Го і да якіх японскі ўрад ніякіх адносін ня мае. Хаця ў гэтых справах, можа быць, прымалі ўдзел японцы, зьяўляючыяся чыноўнікамі ці саветнікамі ўраду Манчжоў-Го, але паколькі гэтыя японскія чыноўнікі і саветнікі Манчжоў Го паступілі на сваю службу па сваёй уласнай волі і дзейнічаюць цалкам пад кіраўніцтвам і кантролем ураду Манчжоў Го, японскі ўрад ня можа прыняць на сябе адказнасьці за дзеяньні гэтых чыноўнікаў ці саветнікаў, з прычыны чаго па гэтых пытаньнях няма патрэбы тут адказваць.

Што датычыцца тых фактаў, якія маюць адносіны да японскага ўраду, то па гэтых пытаньнях было даручана належным мясцовым уладам вытварыць дасканалае расьледваньне, у выніку чаго высьветлілася наступнае:

а) Па пытаньні аб заняцьці японскімі вайсковымі чынамі канторы Перавалачнай Прыстані ў Харбіне справа абстаіць так. У Харбіне з часу вялікай паводкі 1932 года адчуваецца крайні недахоп у пабудовах, пагэтаму камэндатура на прыстані японскага камандваньня, у гэтым годзе пры адкрыцьці навігацыі па рацэ Сунгары, узяла ў арэнду ва ў раўленьня Паўночна-Усходняга рачнога судаходства міністэрства шляхоў зносін Манчжоў Го пабудову, якая знаходзіцца на прыстані 8-га вучастку Аднак, з прычыны таго, што адносна гэтай прыстані яшчэ працягваюцца перагаворы п між паказаным упраўленьнем судаходства і КУЧ аб карыстаньні ёю, японскае камандваньне пры зьняцьці паказанай паб довы ў арэнду ўмовілася, каб аслабаніць яе зараз жа пасьля таго як будуць закончаны гэтыя перагаворы. Аб гэтым, наколькі вядома, было своечасова паведамлена упраўленьнем судаходства КУЧ. Такім чынам, гэтае пытаньне знаходзіцца па-за ўсякай сувязі з перагаворамі якія вядуцца паміж КУЧ і ўпраўленьнем судаход тва, а тым больш няма такога факту, каб японскія ўлады захапілі тое, што ў даны момант застаецца прад етам памянёных перамоў. Акрамя таго, самая пабудова, якую ўзяла ў арэнду японскае камандваньне, знаходзіцца на вучастку для раз'язных шляхоў, распаложаных з-заду прыстані, дзе цяпер вытвараюцца штодзённыя работы КУЧ. Значыцца, з за гэтага пытаньня работы КУЧ нікольк не затрудняюцца і ні ў якім выпадку нельга сказаць, што з боку японскага камандваньня нанесены якія небудзь страты інтарэсам КУЧ.

Па пытаньні аб памянёнай прыстані савецкі пасол у Японіі калісьці зрабіў заяву, у якой ён выказаў пажаданьне аб дображаданым пасярэдніцтве з боку Японіі. Японскае міністэрства замежных спраў тады растлумачыла, што гэта зьяўляецца пытаньнем паміж СССР і Манчжоў-Го і нікольк не даты ыцца японскага ўраду але з далікатнасьці прыняў меры для запыту належных мясцовых улад, каб высьветліць абставіны справы Аднак, японскае міністэрства замежных спраў зусім і ніколі не дала савецкаму боку якога небудзь абяцаньня аб аказаньні садзейнічаньня для хутчэйшага вырашэньня гэтага пытаньня

б) Адносна перагавораў па пытаньні аб плаце за перавозкі японскіх войск ужо амаль дасягнута згода ў тым, каб дапасаваць 50-процантную скідку ў адносінах агульнага тарыфу. У сучасны момант працягваюцца перагаворы па поваду клясыфікацыі і максымальнага танажу вагонаў, да якіх павінен дапасоўвацца гэты зьніжаны тарыф, і па поваду ўстанаўленьня тарыфу ў адносінах броняцягнікоў. Канкрэтныя думкі Квантун кай арміі па гэтых пытаньнях ужо дэталёва паведамлены КУЧ і армія толькі чакае адказу ад апошняй. Такім чынам заява аб тым, што перагаворы па гэтым пытаньні быццам наумысля зацягваюцца японскімі вайсковымі коламі і ў выніку гэтага фінансавае становішча пагаршаецца, не адпавядае сапраўднасьці. Гэтае пытаньне зьяўляецца пытаньнем, якое пры дапамозе духа ўзаемных уступак можа быць урэгулявана ў вельмі недалёкім будучым. Мала таго, Квантунская армія нягледзячы на тое, што перагаворы гэтыя яшчэ ня скончыліся па прозьбе КУЧ ужо ўсяго 5 разоў адпускала ёй авансы, што агулам складае суму ў 2,200,000 іен.

в) У раёне ўсходняй лініі КУЧ вясной гэтага году сапраўды мелі месца выпадкі, калі хунхузы, якія разьбегліся ў горы, час ад часу зьяўляліся і нападалі на ця нікі і краді работнікаў КУЧ і грамадзян з мясцовага насельніцтва. Але гэта толькі зьявішча часовага характара прычым ахвярамі аказваліся ня толькі савецкія грамадзяне, але і грамадзяне японскія і манчжурскія. Пагэтаму нельга сказаць, што прадметамі нападаў зьяўляліся менавіта савецкія грамадзяне. Да таго ж усходняя лінія, дзякуючы зьнішчэньню японскай арміяй разбойнікаў-хунхузаў аднавіла рух са студзеня бягучага году і пасьля гэтага да цяперашняга часу ні разу не спы іла свайго функцыянаваньня.

г) Японскія ўлады ў Манчжуры ніколі ня прывялі ўдзелу ў апошніх канфліктах Манчжоў-Го і СССР. Тое, што гэтыя японскія ўлады, як гаворыць аб гэтым савецкі ўрад, быццам штучна стварылі пытаньне аб паравозах і вагонах, якія знаходзяцца на тэрыторыі СССР, ня можа адпавядаць сапраўднасьці. Гэта, калі не недаверлівыя адносіны савецкага боку, то ва ўсякім выпадку штучн е прыпісваньне фак аў. Наадварот, за апошні час савецкі інфармацыйны орган „Роста" неаднаразова распаўсюджвае зусім неабгрунтаваныя паклёпніцкія інфармацыі аб дзеяньнях японскага камандваньня і японскіх мясцовых улад у Манчжурыі, што прадстаўляе сабою вялікую няпрыемнасьць для японскага боку і аб чым Японія вельмі шкадуе. З прычыны гэтага японскі ўрад ня можа не прасіць ураду СССР аб безадкладным прыняцьці адпаведных мер для абвяржэньня і спыненьня падобных інфармацый.

Мала таго, савецкі ўрад лічыць прычынай запяжкі звароту вагонаў з СССР на КУЧ тое, што КУЧ у выніку ваенных апэрацый паміж японска-манчжурскай арміяй і кітайскімі атрадамі была закуп рана з абодвых канцоў. Праўда, у некаторы час гэтыя канцы былі са раўды закупараны ў выніку групіроўкі ў раёне дарогі антымманчжурскіх бандытаў, але хутка дзякуючы намаганьням японскай арміі, прыкладзеным ёю да зьнішчэньня гэтых бандытаў, на заходняй лініі КУЧ яшчэ са снежня мінулага году, а на ўсходняй лініі са студзеня бягучага году адкры ся рух. Такім чынам, спасылка для апраўданьня затрымкі звароту вагонаў на закупарку КУЧ з абодвых канцоў у выніку ваенных зьяньняў паміж японскімі і іншымі вайскамі зьяўляецца ігнараваньнем фактаў.

д) У красавіку і мэі мінулага году была арыштавана ўладамі Манчжоў-Го дзволі вялікая колькасьць савецкіх грамадзян Паміж тым, арышты былі вытвораны ў сувязі з інцыдэнтамі, якія прасьледвалі прамым ці ўскосным чынам маты прычыненьня страты і шкоды японскай арміі Да ліку гэтых інцыдэнтаў раней усяго належыць крушэньне цягніка з японскімі вайскамі на станцыі Чэн Као Дцэ ўсходняй лініі КУЧ якое здарылася 12 к асавіка мінулага году (ары гэтым інцыдэнце было забіта і паранена некалькі дзесяткаў японскіх афіцэраў і салдат), а затым здарыў шаяся амаль адначасова з гэтым сп обе перашкаджаць занятьцю японскімі вайскамі Шуань-Чэн-Пу (выкрыта загадзя) справа Базанава аб увозе выбуховых матар'ялаў, замах на выбух другога маста Сунгары (выкрыта загадзя), спроба разбурэньня чыгункі ў Старым Харбіне (выкрыта загадзя) і г. д. Японскія жандары па меры патрэбы аказвалі садзейнічаньне ўладам Манчжоў Го і часам прымалі ўдзел у расьледваньні гэтых інцыдэнтаў. Гэта зу ім натуральна, п колькі паказаныя інцыдэнты ставілі сваёй задачай нанясёньне страт і коды японскай арміі. Урэшце няма такога выпадку, калі японскія жандары падвяргалі арыштаваных савецкіх грамадзян катаваньням.

Японскі ўрад упэўнены, што вышэйпаказанае дасьць савецкаму ўраду поўнае разуменьне аб тым, што японская армія і японскія ўлады ў сваіх дзеяньнях ніколі не прасьледвалі маты абвастрэньня становішча на КУЧ, а таксама ніколі не стваралі сур'ёзна а становішча ў сувязі з КУЧ. Што ж датычыцца канфліктаў, якія ўзьніклі ў галіне эксплёатацыі КУЧ то выра шэньне гэткіх павін а за ежыць ад перагавораў паміж належнымі ўладамі СССР і Манчжоў Го, якія зьяўляюцца адказнымі за сумеснае кіраванне чыгункай. Аднак, пад рымка мірных узаемаадносін паміж СССР і Манчжоў-Го ёсьць важнейшая аснова агульнага міра на Далёкім Усходзе. Японскі ўрад выходзячы з абавязацельстваў, усталаемых на яго пастановамі Япона Манчжурскага пратаколу, мае сталую запікаўленасьць у захаваньні агульнага парадку і супакою ў Манчжоў Го З прычыны гэтага, японскі ўрад, ня можа не зварочаць сур'ёзнай увагі на вынік памянёных канфліктаў і разам з тым ня можа ня выказаць свайго шчырага пажаданьня аб тым, каб як мага хутчэй гэтыя канфлікты прывялі да справядлівага і павіннага ўрэгуляваньня.

* * *

У адказ на вышэйпрыведзенае паведамленьне, намесьнік народнага камісара па замежных справах тав. Г. Я. Сакольнікаў зрабіў 31 мая г. г. японскаму паслу п. Ота назву:

1. Савецкі ўрад прымае да ведама пацьвярджэньне японскім урадам яго ранейшых заяў аб тым, што ён будзе адносіцца з паважаньнем да правоў і інтарэсаў СССР ў Паўночнай Манчжурыі і што ён не дапусьціць парушэньня ў выніку прадпрынятых ім ў Манчжурыі дзеяньняў, інтарэсаў СССР на КУЧ.

Гэтыя запэўніваньні японскага ўраду выключаюць магчымасьць для японскага ўраду вынімаць з сябе адказнасьць за агульнавядомыя факты парушэньня савецкіх інтарэсаў ва ўмовах цяперашняга становішча ў Манчжурыі манчжурскай уладай пад тым фармальным п вадам, што гэтыя факты адносяцца выключна да кампэтэнцыі Манчжоу Го. Савецкі ўрад спадзяецца, што паколькі японскі ўрад абяцаў непарушэньне інтарэсаў СССР ў Паўночнай Манчжурыі і ў прыватнасьці на КУЧ і абяцаў інструктаваць японскае камандваньне і сваіх чыноўнікаў у Манчжурыі не дапус зць нанясеньня страт савецкім інтарэсам, ён зробіць з гэтага практычныя вывады,

2 Савецкі ўрад ня можа ня выказаць жалю па поваду таго, што японскі ўрад у сваім адказе поўнасьцю абышоў маўчаньнем канфлікт, ўзьнікшы ў сувязі з зусім незаконнымі і неабгрунтаванымі прэтэнзіямі манчжурскіх улад па поваду належачых СССР паравозаў сэрыі „Е". Гэтае пытаньне ўладамі Манчжоу-Го пры прамым садзейнічаньні і падтрымцы японскіх чыноўнікаў і мясцовых японскіх улад быў скарыстан як галоўны повад для гвалтоўных аднабаковых і непраўамерных дзеяньняў, нанёсшых буйнейшыя страты інтарэсам СССР.

Савецкім ўрадам у свой час былі прыведзены вычэрпваючыя дакументальныя пасьведчаньні належнасьці гэтых паравозаў СССР і бясспрэчныя доказы поўнай неабгрунтаванасьці прэтэнзій манчжурскіх улад.

Японскі ўрад ня прывёў і ня можа прывесьці ніводнага аргументу ў апраўданьне прэтэнзій манчжурскіх улад і іх паводзіны ў канфлікце аб паравозах Паміж тым, па думцы савецкага ўраду, правільнае растлумачэньне гэтага пытаньня японскім урадам манчжурскім і мясцовым японскім уладам прывяло б да спыненьня спроб нанасіць страты бясспрэчным савецкім інтарэсам і садзейнічала б устанаўленьню нармальнага становішча на чыгунцы.

3. Што датычыцца тлумачэньняў даваемых у адказе японскага ўраду па пытаньні аб заняцьці японскімі вайсковымі чынамі Перавалачнай Прыстані КУЧ, аб затрымцы ва ўплацэ японскім вайсковым камандваньнем прылічваючайся з яго запазычанасьці за перавозку японскіх войск, аб катастрафічным становішчы, стварыўшымся дзякуючы недастатковым мерам ахоны на ўсходняй лініі КУЧ, а таксама аб масавых арыштах і катаваньнях савецкіх грамадзян, то савецкі ўрад канстатуе, што гэтыя тлумачэньні не абвяргаюць прыведзеных ў заяве ад 16 красавіка дакладна і дакументальна, абгрунтаваных фактаў, з прычыны гэтага савецкі ўрад ўноў пацьвярджае сваю заяву ад 16 красавіка і выкладзеныя ў ім факты і выказвае ўпэўненасьць; што японскі ўрад прыме залежачыя меры да больш дасканалага расьледваньня гэтых фактаў і сапраўднага спыненьня ўсіх дзеянь яў, накіраваных да нанясеньня страт інтарэсам СССР.

У адказе японскага ўраду маецца скарга на распаўсюджваньне агэнцтвам „Роста" быццам пак лёпніцкіх зьвестак аб дзеяньнях японскага вайсковага камандваньня і японскіх мясцовых улад. Аднак паколькі ў гэтым адказе ня маецца аніякіх канкрэтных указаньняў, савецкі ўрад ня можа лічыць гэтую скаргу абгрунтаванай.

4 Сваёй гатоўнасьцю ўступіць ў перамовы аб продажу КУЧ, савецкі ўрад ўпаўне ясна выказаў сваю волю да адхіленьня глебы для канфліктаў, адмоўна адбіваючыхся на існуючых добр суседзкіх адносінах паміж СССР і Японіяй. Імкненьне да ўмацаваньня гэтых адносін зьяўляецца адным з элемэнтаў савецкай мірнай палітыкі. Савецкі ўрад ўправе разьлічваць, што са свайго боку японскі ўрад цьвёрда будзе кіравацца такімі ж імкненьнямі.

Савецкі ўрад дасканала інструктаваў і інструктуе свае прадстаўнікоў на КУЧ аб неабходнасьці дзелавога супрацоўніцтва з манчжурскімі ўладамі на аснове Пекінскай і Мукдэнскай згод, у прыватнасьці, па рэгуляваньні спрачных пытаньняў.

Да разраду такіх спрачных пытаньняў адносіцца абмен вагонамі паміж КУЧ і савецкімі чыгункамі. Ня можа быць сумненьня ў тым, што ўсе вагоны належачыя СССР, павінны быць зьвернуты савецкім чыгункам, роўна як і ўсе вагоны, належачыя КУЧ, павінны быць зьвернуты КУЧ.

Савецкі ўрад чакае, што японскі ўрад будзе дзейнічаць у тым-жа напрамку і, ў прыватнасьці, ня будзе дапускаць ніякіх актаў, накіраваных да пагоршаньня становішча КУЧ.

Савецкі ўрад выказвае ўпэўненасьць, што японскі ўрад прыме ўсе залежачыя ад яго меры да спыненьня і недапушчэньня якіх небудзь аднабаковых і непраўамерных дзеяньняў з боку манчжурскіх і мясцовых улад і да падтрыманьня на КУЧ становішча, базуючагася на дакладным выкананьні Пекінскай і Мукдэнскай згод.

Савецкі ўрад выказвае таксама ўпэўненасьць у тым, што пры наяўнасьці добрай волі абодвых бакоў, спрачныя пытаньні, узьнікшыя на КУЧ, змогуць быць поўнасьцю вырашаны ў сяброўскім духу, у адпаведнасьці з заключнымі заявамі японскага адказу, якія савецкі ўрад ўпаўне разьдзяляе.

31 мая 1933 году.

„У АБВАСТРЭНЬНІ ГЕРМАНА-АЎСТРЫЙСКІХ АДНОСІН ВІНАВАТА АЎСТРЫЯ".

Германская газэта аб канфлікце з Аўстрыяй.

БЭРЛІН, 29. Афіцыёз германскага міністэрства замежных спраў „Дэйчэ дыплёматышэ палітышэ карэспондэнц", гаворычы пра цьверджаньні аўстрыйскага друку аб тым, што дэхрэт аб увядзеньні віз для ўезду ў Аўстрыю зьяўляецца ўмешваньнем ва ўнутраныя справы Аўстрыі, піша. «Цяперашняя афіцыяльная Аўстрыя вядзе бязьлітасную барацьбу супроць нацыянал-сацыялістаў, якіх яна ва што-б там ні стала хоча адхіліць ад удзелу ва ўладзе. Таму адказнасьць за выкліканае гэтым напружаньнем ўнутрыпалітычных адносін падае выключна на Аўстрыю. Аднак, аўстрыйскі ўрад павінен уявіць сабе, што непажаданы яму нацыянал-сацыялізм зьяўляецца пануючым рэжымам у Германіі. Усе выпады і падазрэньні супроць нацыянал-сацыялісцкага руху тым самым накіраваны супроць Германіі, кіраўнік ураду якой адначасова зьяўляецца нацыянал сацыялістам».

2808 коняматак павінны быць злучаны у гэтую вясну.

„КАНТРОЛЬ І ПРАВЕРКА ФАКТЫЧНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЗЛУЧНОЙ КАМПАНІІ ЎСКЛАДАЮЦЦА НА ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ І СЕЛЬСАВЕТЫ

(З пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы).

Навярстаць упушчанае.

Пакрыць 2808 матак у вясеньнюю злучную кампанію гэтага году, з тым, каб на будучы год на гэтую колькасьць павялічыць конскае пагалоўе па нашым раёне—такаво заданьне партыі і ўраду.

У гарЗА маецца спэцыяльны інспэктар па канягадоўлі Бугаёў. Атрымаўшы ад Наркамзема заданьне па злучцы, ён разьвярстаў яго па сельсаветах для адвазобнага сэктара, па калгасах, па саўгасах і каапгасах. Карацей кажучы, кожная гаспадарка атрымала кантрольную лічбу па злучцы. Былі намечаны 69 злучных пунктаў, з якіх 19 з чыстакроўнымі вытворнікамі. А далей..

22 мая мы зьвярнуліся ў гарЗА за зьвесткамі, як праходзіць злучная кампанія. Нам адказалі: „Да 29 красавіка па няпоўных данных было пакрыта 98 кабыл, а колькі зараз—невядома, штук 200 можа будзе". «Не дасылаюць зьвестак калгасы»,—імкнуўся апраўдацца Бугаёў Аказваецца, ніхто ніякіх зьвестак ні адкуль не запытваў Уздумае рахункавод калгасу альбо статыстык сельсавету даслаць, дашле, а не дашле, то і так добра. І навошта іх і дасылаць, калі ў гарЗА ніхто гэтых зьвестак не праглядвае, якы валяюцца раськіданымі па сталах, за шафамі.

Мы паспрабавалі даведацца аб заданьнях у разрэзе сельсаветаў, аб тым, які калгас якім злучным пунктам абслугоўваецца. Але спробы былі дармны: нічога невядома. «Дзесьці былі, але зараз не магу знайсьці»,—адказаў Бугаёў. Скажуць—гэта тэхнічная справа. Так, гэта тэхнічная справа, паказваючая як гарЗА ў прыватнасьці Бугаёў, цікавіцца разьвіцьцём конскага пагалоўя і ажыцьцяўленьнем асноўных жерапрыемстваў па пашыраньні конскага статку.

Па раёне маецца 4 вэтэрынарных і 4 зоатэхнічных пунктаў. Маюцца вэтфэльчары, але ніхто злучнай кампаніяй не займаецца. Толькі 27 мая гарЗА дадумаўся накіраваць паперкі вэтпунктам аб злучной кампаніі Не прыцягнуты да кіраўніцтва гэтай кампаніяй і вэтэрынарны інстытут.

27 мая мы атрымалі зьвесткі па шчы на 20 мая. Па 4-х сельсаветах адсутнічаюць. Становішча такое: пакр 223 кабыліцы, што складае 7,9 проц Вось вынік безадказных адносін з боку да выкананьня заданьня партыі і ўраду га можна было чакаць, бо ў гарЗА няма ніцтва І нас зьдзіўляе чаму гарсавет д га часу сур'ёзна не задумаўся над станом аднаго з важнейшых сваіх зьвеньняў, гэтага часу не прыняў канкрэтных заха ўмацаваньня яго кіраўніцтва.

Пункт штучнага абсемяненьня ма работае Бугаёў умудрыўся гэту справу ліць. Па-першае, ён паставіў на гэты насуперач дырэктывам Наркамзему, выт 20-гадовага ўзросту, што адзначае па увесь сэнс штучнага абсемяненьня, п ён ня здолеў нават да гэтага часу а на пункт неабходныя маючыяся ў нас прылады.

Але справа ня толькі ў гарЗА. Кір сельсаветаў і сельпартячэек такс цікавіліся гэтай справай. А станов асобным сельсаветам самае ганебнае. У В цах выканана—2,7 проц. злучной ка у Віцебскім сельсавеце—2 проц., у Рудні 1,3 проц., у Шумяках—1,8 проц. у коўскім, Старасельскім і Міхалёўскім с ветах не пакрыта ніводнай маткі.

Мы спадзяемся, што гарком КП(б)Б с сваё слова па справе правалу злучной кам што пракуратура тэрмінова прыцягне ві тых да адказнасьці.

Адначасова трэба адзначыць, што час не ўпушчаны, што частку ўпушчанага м ма навярстаць. Зараз жа трэба праверыц кампаніі ў кожным калгасе, каапгасе, саў на пунктах адпаасобліваў. Выявіць у ко калгасе, у кожнай брыгадзе людзей, адка за злучную кампанію, якія-б сачылі за злучкі, прыняць усе захады да выкана заданьня, дадзенага партыяй і ўрадам разьвіцьці конскага пагалоўя.

АБ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЗЛУЧНОЙ КАМПАНІІ ПА КОНЯХ.

Пастанова гарсавету ад 26 мая 1933 г.

1. На падставе пастановы НКЗБ ад 4 мая г. г. абвясьціць па Віцебскім раёне конкурс-спаборніцтва на лепшае правядзеньне злучной кампаніі па конях з 1 чэрвеня г. г.

2. Для кіраўніцтва ходам конкурсу вылучыць штаб у складзе тт. Пэўланка (старшыня), Шубіна (нам. старшыні), Старынскага (вэткамбінат), Галавёнка (МТС), Бугаёва (вэтінспэктар), Рэўкова (калгас імя Чырвоняй а і прадстаўнікоў ад гаркому ЛКСМБ, рэда газ. „Віцебскі пралетары" і саўгасу „Доўж

3. Для прэміяваньня за лепшае правяд не злучной кампаніі па конях вылучыць міяльны фонд у суме 500 руб. Разьмерка не прэміявальнага фонду ўскласьці на шт

У МАШКАНАХ ПРАВАЛЬВАЮЦЬ ЗЛУЧНУЮ КАМПАНІЮ

(Ліст загадчыка коняфэрмы і злучнога пункту).

У калгасе імя Сталіна, Машканскага сельсавету, існуе каняводчая фэрма Пры фэрме маецца злучны пункт з двумя стальмі вытворнікамі, якія здольны пакрыць у злучнай кампаніі да 100 кабыл. На 28 мая пакрыта толькі 43 кабылы. Гэткае становішча ні што іншае, як правал кампаніі, бо прайшло ўжо 2|3 часу злучнага сэзону. і за гэты час магчыма было пакрыць 60—70 кабыл. Гэта тое, што датычыцца злучнага пункту.

Плян злучкі па каняводчай фэрме выкананы, пакрыта 18 кабыл. Горш абстаіць справа са злучкай калгасных рабочых кабыл. Усяго па калгасе імя Сталіна пакрыта 18 кабыл, а трэба па плану 42 (ня ўлічваючы коняфэрмы). Гэта і ёсьць фактычны зрыў злучнай кампаніі.

Зрываюць работу па злучнай кампаніі ніхто іншы, як брыгадзіры, якія не вядуць на пункт кабыл Асабліва сабатуюць злучную кампанію брыгадзіры Партухоў, Янчылін, Тоўстабрухаў. Праўленьне калгасу ніякіх мер ня прымае да такіх брыгадзіраў, якія сваёй бязьдзейнасьцю тармозяць далейшае разьвіцьцё конскага пагалоўя. Трэба адзначыць, што брыгада Султанава ня прыводзіла кабыл на паўторную злучку, а таму нельга ўстанавіць вынік злучкі. Калгасьнікі Лавуткін Трахім, Машканаў Пятро, Лавуткін Зьмітрок павінны былі яшчэ 17 і 18 красавіка прывесьці кабыл для паўторнай злучкі і не прывялі. Такія канкрэтныя вінаватыя застаюцца непакаранымі.

Наогул па нашым Машканскім сельсавеце лічаць, што злучную кампанію трэба паста на самы апошні плян, сельсавет ня кіру тай справай. Работа па злучной кампані шчана на самацёк. Яшчэ трэба дадаць, праўленьне не забясьпечыла карміавы для вытворнікаў, што зрывае бесьперабо работу па злучцы.

Цялышо

* * *

МАШКАНЫ. (Ад нашага спэцыяльнага рэспандэнта).

Ліст тав. Цялышова цалкам падць джаецца. У Машканах ня кіруюць злу кампаніяй. Хоць сельсавет ідзе першым у не па правядзеньні злучной, але тэмпы р ты і тут недастатковыя. Сельсавет і п ячэйка лічаць, што злучная кампанія пачакаць, «моў у нас ідзе сяўба».

Злучная кампанія не спалучаецца з вядзеньнем сяўбы Адстаюць калгасы імя К ніна, «Чырвоны кастрычнік» і „Бальшав дзе злучная пушчана на самацёк і, галоў старшыні калгасаў тт. Бараноўскі, Лядзен Зюзікаў ніякіх захадаў ня прымаюць, выканаць заданьне. Напрыклад у калгасе Сталіна сярод асобных брыгадзіраў (Султ і Партухоў) ідуць разважаньні супроць злу

Б. Зэлікс

АД РЭДАКЦЫІ.

Чакаем ад гарсавету тэрміновага паведамленьня па сутнасьці ліста тав. Цялышо прынятых мерах.

ПРА ЗЛУЧНУЮ ЗАПАМЯГАЛІ.

На Замастоцкім сельсавеце злучная кампанія пушчана на самацёк. Ніхто з старшынь калгасаў не клапаціцца аб гэтым. У калгасах «М-Чэрніца», «Шчамілаўка», „Замасточча" ня злучана ніводнае матки. У калгасе „Замасточча" ёсьць племянны вытворнік, які з рук вон дрэнна даглядаецца.

На ўсім сельсавеце злучаны усяго 3 кабылы. Вылучаны адказным па гэтай справе Колатаў нічога ня робіць. Ён, мусіць, ка што справа злучкі зьяўляецца адным з га ных момантаў барацьбы за разьвіцьцё конс пагалоўя.

Парт'ячэйцы трэба заняцца справай злучной кампаніі і вінаватых у зрыве пацягнуць да суровай адказнасьці.

Л. Воранаў.

БДТ-2 НА ПАСЕЎНАЙ

Беларускі другі дзяржаўны тэатр напружана працуе над пастаноўкай клясычнай камэдыі Бомаршэ „Жаніцьба Фігаро". Аднак, гэтая праца не перашкодзіла акторскаму калектыву тэатру актыўна ўключыцца ў пасеўкампанію. Калектыў разьбіўся на тры брыгады, кожная з якіх у пазарэпэтыцыйны час падрыхтавала па два паказы. 1-я і 2-я брыгады выехалі ў Віцебскі і Лёзьнянскі раёны; 3-я брыгада, заставшыся ў горадзе і ня спыняючы працы над пастаноўкай „Жаніцьба Фігаро", рабіла асобныя выезды ў сельсаветы.

За 12 дзён працы брыгад у раёнах імі абслужана больш 20 калгасаў. Пройдзена пешкі 150 кілёмэтраў (коні браліся выключна для перавозкі дэкарацый і іншых пастановачных рэчаў. Кожнаму абслужанаму брыгадамі калгасу была перададзена ў падарунак бібліятэчка. Камсамольскім актывам брыгад была зроблена праверка працы і дадзены інструктаж вайсковым гурткам калгасаў і ячэйкам Асоавіахэму.

Значную ролю ў працы брыгад адыграла тое, што канцэрт, які ўваходзіць у праграму аднаго з паказаў, быў так пабудаваны, што даваў магчымасьць выкарыстоўваць мясцовы матар'ял. та паглыбіла працу брыгад, наблізіла яе а канкрэтных момантаў жыцьця і працы таго іншага калгасу.

Нажаль, прыходзіцца канстатаваць, што ўсе кіраўнікі калгасаў у дастатковай меры памагалі брыгадам у іх працы. Не абыйшлі таксама і без варожых вылазак клясавага рага. Так, у калгасе імя Дзяржынскага кул кія элемэнты, схаваўшы афішу пра прыезд гады, спэцыяльна наладзілі вечарынкі.

Вынікі падарожжа, увага да яго віцебс партарганізацыі і гарсавету, натхнілі калект БДТ-2 на далейшае разгортваньне гэтай пра Зараз яшчэ адна брыгада, вылучаная са ск ду калектыву, выехала ў Бешанкавіцкі раё тым, каб да канца пасеўнай абслужыць яш 20 калгасаў гэтага раёну.

М. Б.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ОПТЭ • ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ

БЮРО ПАДАРОЖЖА ЦС ОПТЭ

АРГАНІЗУЕ ПАДАРОЖЖА па Каўказе, Алтаі, Волзе, у Крым, Маскву, Ленінград і інш. раёны СССР.

Запіс у бюро падарожжа ЦС ОПТЭ (Масква, Нікольская, Вятошны, 9), а таксама ў Менскім і Віцебскім саветах ОПТЭ.

473—1—1

ДА ВЕДАМА ЖАКТАЎ, ДАМАКІРАЎНІЦТВАЎ І ФАБРЫЧНА-ЗАВАДЗКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

Да правядзеньня месячніка чыстаты Віцебскай міжраённай базай Белаптэкакіраўніцтва АТРЫМАНА ХЛЁРНАЯ ВАПНА.

Водпуск вытвараецца ў любой колькасьці з магазынаў № 6 па вул. Леніна 12 і ў магазыну № 2 па Шасэйнай вул.

494—1—1

Друкарні „КАМІНТЭРН"

ПАТРАБУЮЦЦА вучні для навучаньня НА НАБОРШЧЫКАЎ ад 18 год, з адукацыяй ня ніжэй 6—7 груп.

Адрас: Бальшавіцкая, 10.

Адміністрацыя.

ЗГУБЛЕНУЮ круглую пячатку Віцебскай адзінай вытворчай гандлёвай каапэратыўнай арцелі інвалідаў імя 25 га Кастрычніка ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНАЙ.

493—1—1

ФЗВ ПАНЧОШНІКАЎ АБВЯШЧАЕ НАБОР ВУЧНЯЎ

у колькасьці 350 чал У БЕЛАРУСКУЮ І ЯЎРЭЙСКУЮ ГРУПЫ.

Прымаюцца выключна дзяўчаты ва ўзросьце ад 15 да 18 год з адукацыяй га IV, V, VI, VII груп.

ФЗВ рыхтуе кадры для панчошных фабрык імя Клары Цэткін і КІМ па наступных кваліфікацыях: трыкатажніцы, кятлёўшчыцы і вязальшчыцы

Вучні забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй, сталоўкай і па снабжэньні апраўнены да катэгорыі рабочых гэтай прамысловасьці.

Трэба прадставіць дакуманты: 1) аб узросьце, 2) аб сацстановішчы і 3) аб адукацыі.

Канцаляры адчынена з 10 гада. да 5 гада. увечары (Ленінская, № 8|2).

Таксама адчыняецца на два летніх месяца ДАЗАВУЧ, куды прымаюцца падлёткі ад 15—18 год, якія ня скончылі 4-й групы.

470—3—2

ПРАДАЕЦЦА КАМЕННЫ ДОМ па Буднікаву завулку № 6 (3-і раён). Запытаць Шэвелеву.

495—1—1